ЛІСТАПАД 30 СУБОТА
№ 39 (495)
1940 год
ЦАНА 20 КАП.

Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА

ОРГАН ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР І УПРАЎЛЕННЯ ПА СПРАВАХ МАСТАЦТВАЎ ПРЫ СНК БССР

Кіраў

Шасць год назад ворагі народа, трацкісцка-бухарынскія бандыты злодзейска забілі С. М. Кірава — любімца партыі, любімца рабочага класа, любімца ўсяго совецкага народа. Ад рук подлых наймітаў капіталізма загінуў верны сын партыі і народа, які ўсё сваё жыццё аддаў барацьбе за шчасце працоўных.

Незабыўны Сяргей Міронавіч Кіраў быў выдатнейшым палітычным і дзяржаўным дзеячом нашай велічнай сталінскай эпохі. Вышаўшы з глыбінь народных мас, вырасшы ў радах большэвіцкай партыі, Сяргей Міронавіч даў ярчэйшы ўзор самаадданага служэння вялікай справе партыі Леніна—Сталіна. «Уся партыя, увесь рабочы клас і ўвесь народ нашага Совецкага Саюза будзе свята шанаваць, будзе берагчы, як зяніцу вока, памяць аб таварышу Кіраву... Мы, партыя і рабочы клас, паставім помнік Сяргею Міронавічу ў справах соцыялізма, у пабедным шэствіі комунізма наперад» (Жданаў).

Сяргей Міронавіч Кіраў належаў да той стальной большэвіцкай кагорты, якая прайшла суровы шлях барацьбы ў падполлі, пранесла праз турмы і ссылкі нязломную волю да перамогі, бясстрашна і ўпэўнена ішла к дасягненню велічнай мэты: умацоўвала рады большэвіцкай партыі, згуртоўвала пад яе пабеданоснымі сцягамі рабочы клас.

Біяграфія Сяргея Міронавіча — класічная біяграфія рэволюцыянера-прафесіянала, мужнага большэвіка, выдатнага арганізатара і кіраўніка народных мас. Шмат выдатных фактаў, ярчэйшых падзей гісторыі большэвіцкай партыі, гісторыі барацьбы за перамогу і ўмацаванне Совецкай улады, гісторыі соцыялістычнага росквіту совецкай зямлі звязана з дзейнасцю, з імем лепшага вучня і саратніка Леніна і Сталіна — імем і дзейнасцю Кірава. Арганізатар падпольнай большэвіцкай друкарні ў Томску ў 1905 годзе. Пазней — большэвік-публіцыст, страсны агітатар, арганізатар рэволюцыйных выступленняў на Паўночным Каўказе. Адзін з мужных кіраўнікоў барацьбы за арганізацыю Советаў у Закаўказзі, за ўмацаванне заваёў Кастрычніцкай рэволюцыі. Арганізатар герaічнай абароны Астрахані ў часе грамадзянскай вайны. Кіраўнік большэвікоў Азербайджана. І, нарэшце — кіраўнік ленінградскіх большэвікоў, пролетарыяў горада Леніна, адыграўшы выключную ролю ў разгроме асінага гнязда ворагаў партыі і народа — трацкісцка-зіноўеўскіх бандытаў. Сакратар ЦК ВКП(б), член Палітбюро ЦК ВКП(б), сакратар Ленінградскага абкома ВКП(б), бліжэйшы друг і саратнік вялікага Сталіна. Вось, каротка, слаўныя вехі жыццёвага шляху мужнага, непахіснага большэвіка Сяргея Міронавіча Кірава.

З імем Кірава непарыўна звязаны шматлікія герaічныя справы совецкага народа, у прыватнасці, справы соцыялістычнага развіцця і росквіту слаўнага горада Леніна.

Сяргей Міронавіч Кіраў быў чулым, клапатлівым другам совецкай інтэлігенцыі. Шмат увагі і сіл аддаваў ён справе вырошчвання і выхавання кадраў совецкай інтэлігенцыі, узбраення іх навукай навук — марксізмам-ленінізмам. Бо «марксізм-ленінізм — гэта яркая сапраўдная і адзіная навука, якая вучыць працоўных перамагаць сваіх ворагаў». (С. М. Кіраў).

Пытанні комуністычнага выхавання працоўных былі прадметам няспынных і асаблівых клопатаў Сяргея Міронавіча. Першую неабходнасць большэвіцкага вырашэння задач комуністычнага выхавання мас неаднаразова, з усёй страсцю і сілай трыбуна партыі, падкрэсліваў Сяргей Міронавіч: «Яшчэ і яшчэ раз паўтараю, — гаварыў ён, — глыбокую памылку зробім мы, калі будзем думаць, што чым бліжэй да перамогі, тым менш мы адчуваем патрэбу ў марксісцка-ленінскай тэорыі.

Ніколі ні ў адну эпоху гэта тэорыя не іграла такога каласальнага значэння, якое яна іграе цяпер».

Сяргей Міронавіч быў вялікім і любімым другам совецкіх літаратараў, работнікаў мастацтваў. Ён з надзвычайнай увагай і любоўю дапамагаў творчай рабоце пісьменнікаў — развіццю літаратуры, дапамагаў здабыццю новых і новых поспехаў майстрам кіно, тэатра, архітэктуры, музыкі, выяўленчага мастацтва. Любоўна заахвочваў, падтрымоўваў ён маладыя таленавітыя сілы. І з вялікай сілай і непрымірымасцю большэвіка наносіў ён сакрушальныя ўдары ўсякім спробам ворагаў выкарыстаць у сваіх мэтах трыбуну літаратуры альбо мастацтва.

І светлы, благародны вобраз любімага сына партыі і народа, чалавека мудрага розуму, сталёвай волі, гарачага сэрца — Сяргея Міронавіча Кірава натхняе і будзе натхняць пісьменнікаў, работнікаў мастацтваў на ўзнаўленне гэтага велічнага вобраза ў літаратуры, у кіно, у жывапісу, у тэатры, у скульптуры, — ва ўсіх галінах творчасці. Работы па распрацоўцы вобраза незабыўнага Сяргея Міронавіча, па адлюстраванню яго жыцця, яго вялікіх большэвіцкіх спраў — адна з пачаснейшых надзённых задач работнікаў літаратуры і мастацтваў.

Совецкі народ шануе памяць аднаго з самых выдатных і яркіх людзей нашай эпохі, які быў памочнікам, спадвіжнікам і другам вялікага Сталіна, — памяць Сяргея Міронавіча Кірава.

Вялікі і магутны совецкі народ пад валіцельствам вялікага Сталіна пабеданосна працягвае справу, страсным і непахісным барацьбітом, за якую быў Сяргей Міронавіч Кіраў, — справу будаўніцтва комунізма.



Заўтра, 1 снежня, спаўняецца 6 год з дня здрадніцкага забойства трацкісцка-зіноўеўскай бандай сакратара і члена Палітбюро ЦК ВКП(б), члена Прэзідыума ЦВК СССР, сакратара Ленінградскага абкома і гаркома ВКП(б), любімца партыі і народа — **Сяргея Міронавіча КІРАВА.**

На здымку: **С. М. Кіраў у сваім кабінеце.** З партрэта мастака Яр-Краўчанкі.

НА РАДЗІМЕ ПАЭТА

85-годдзе з дня смерці А. Міцкевіча

Ніколі яшчэ Навагрудак не бачыў такой урачыстасці, як у гэтыя дні, дні святкавання 85-годдзя з дня смерці геніяльнага паэта польскага народа Адама Міцкевіча, калі ўсе працоўныя вялікага Совецкага Саюза ўшаноўвалі яго неўміручую памяць. Але ў працоўных Навагрудчыны асаблівая радасць. Яны святкавалі юбілей свайго выдатнага земляка.

«Тут на рассвеце жыцця распраўляў крыллі к палёту Адам Міцкевіч». Гэтыя словы залатымі літарамі напісаны на мемарыяльнай дошцы доміка, у якім нарадзіўся і вырас А. Міцкевіч. Клапатліва сабралі і рупліва берагуць у Навагрудчыне ўсё, што засталося, што ўцалела ад часу слаўнага земляка. Народ, а не панскія ўлады, бярог яго памяць. Сардэчную любоў да паэта пранеслі праз дзесяцігоддзі працоўныя ўсяго свету, польскія рабочыя і сяляне, беларусы, украінцы, рускія.

Характэрна гісторыя стварэння помніка паэту ў Навагрудку. У 1886 годзе па хадайніцтву землякоў А. Міцкевіча быў аб'яўлен конкурс на помнік. Было прадстаўлена 8 розных праектаў. Але дазволу паставіць помнік улады не далі. У 1893 годзе дачка паэта Марыя зноў узбуджае хадайніцтва. І зноў адмаўляюць. І жыхары горада рашаюць у памяць паэта, свайго праслаўленага на ўвесь свет земляка, насыпаць курган. На ўскраіне Навагрудка, ля руін старадаўняга замка, куды зорнымі начамі прыходзіў юны Міцкевіч, дзе складаў ён свае вершы, пачаў вырастаць народны помнік А. Міцкевічу. Насыпалі яго не толькі землякі. Усе, каму дорага была памяць аб паэту, ехалі сюды, везучы з сабой у ранцах, у кайстрах, у кішэнях зямлю радзімы на курган паэта. З кожным годам ён узнімаўся ўсё вышэй і вышэй, і цяпер адсюль у пагодны дзень як на далоні відзён увесь Навагрудак з яго прыгожымі жывапіснымі ваколіцамі.

Па дарозе з Баранавіч, за 30 кіламетраў да Навагрудка, побач дарогі, акружаная старымі дубамі, разаслалася празрыстая гладзь возера. Цяжка абмінуць яго без хвалявання, без таго, каб не ўспомніць, што гэта возера было ўлюбёным месцам страснага, свабодалюбівага летуценніка.

Машыны спяшаюць ход. Свіцязь! Свіцязь! Госці, што едуць у Навагрудак на міцкевічаўскія святы, беларускія, рускія, польскія, яўрэйскія пісьменнікі з Масквы, з Мінска, з Беластока,—усе з душэўнай пашанай узыходзяць на высокі бераг велічна спакойнага возера. Паклон табе, слаўная Свіцязь, паклон табе, навагрудская зямля, нарадзіўшая і ўзгадаваўшая Адама Міцкевіча!

Ветліва сустракаюць працоўныя Навагрудка гасцей, з'ехаўшыхся на свята з розных гарадоў, раёнаў, заводаў, фабрык і калгасаў вызваленай беларускай зямлі, совецкіх пісьменнікаў, паэтаў, артыстаў са сталіцы рэспублікі, з чырвонай сталіцы Совецкага Саюза —Масквы.

25 лістапада пісьменнікі сустрэліся з настаўнікамі горада. Пісьменнікі, паэты, крытыкі, настаўнікі, кіруючыя совецкія і партыйныя работнікі гаварылі на розных мовах — на беларускай, польскай, рускай, яўрэйскай, але да кожнага з прысутных даходзіў сэнс іх слоў. Сталінская дружба народаў—вось што стварыла ўсе магчымасці для росквіту соцыялістычнай культуры. Наш Міцкевіч!—з гонарам і па праву заяўляюць усе народы Совецкага Саюза.

Ва ўсхваляванай прамове пісьменнік Кузьма Чорны расказаў пра непасрэдную блізасць, замілаванне і любоў А. Міцкевіча да беларускага народа, да яго мовы, да яго вуснай творчасці, з жывых крыніц якой чэрпаў ён паэтычную сілу, чаруючую прыгажосць сваіх твораў. Аб благароднай дружбе Міцкевіча з Пушкіным, з рускімі паэтамі—барацьбітамі за свабоду свайго народа расказаў навуковы супрацоўнік Акадэміі навук Л. Бараг. З прамовамі выступілі крытыкі Б. Марк, М. Ларчанка, настаўнік С. Станкевіч. Польскі паэт Ю. Равіч, беларускі настаўнік С. Мялешка чыталі свае вершы, прысвечаныя Міцкевічу.

26 лістапада адбыўся вялікі ўрачысты вечар, прысвечаны памяці А. Міцкевіча. Па даручэнню юбілейных камітэтаў раёна, вобласці партыйных і совецкіх арганізацый, вечар адкрыў старшыня ўрадавага рэспубліканскага камітэта па ўшанаванню памяці паэта пісьменнік-ордэнаносец Міхась Лынькоў. Перапоўненая аудыторыя ўважліва слухала яго яркую, хвалюючую прамову аб неўміручым геніі сусветнай паэзіі, выдатнейшым сыну польскага народа.

З вялікім дакладам аб жыцці і творчасці А. Міцкевіча выступіў паэт-ордэнаносец Пятро Глебка. Сардэчнае прывітанне перадаў ад пісьменнікаў Масквы навагрудчанам — землякам Міцкевіча — крытык Ю. Юзоўскі.

Цёпла сустрэлі прысутныя беларускіх паэтаў Аркадзія Куляшова і Максіма Танка, якія чыталі свае пераклады вершаў Міцкевіча. Вершы Міцкевіча ў перакладзе на яўрэйскую мову чыталі Б. Гелер, І. Эміот, Х. Малыцінскі, на рускую мову — К. Цітоў, уласныя вершы, прысвечаныя Міцкевічу, прачыталі польскія паэты Т. Главацкі і Ю. Равіч.

У заключэнне вечара адбыўся канцэрт, у якім выступілі хор навагрудскай польскай школы, народная артыстка БССР І. Ждановіч, піяніст Вайнберг, артыст Пігулеўскі, артысты Баранавіцкага тэатра лялек і хор Дзяржаўнай філармоніі БССР пад кіраўніцтвам І. Бары.

27 лістапада адбылася сустрэча пісьменнікаў з вучнямі школ Навагрудка, прысутнічала 2.000 вучняў. З прамовамі выступілі Міхась Лынькоў, Яніна Бранеўская, крытык Л. Бараг. З чыткай перакладаў твораў Міцкевіча і сваіх вершаў выступілі паэт-ордэнаносец П. Глебка, М. Танк, А. Куляшоў, Х. Малыцінскі, Т. Главацкі, Б. Гелер, І. Эміот, К. Цітоў.

Асабліва хвалюючы ўспамін застаецца ў гасцей — рускіх, беларускіх, польскіх і яўрэйскіх пісьменнікаў — ад спаткання з вучнямі Навагрудскага педвучылішча. У зале сабралася моладзь, якая яшчэ нядаўна магла толькі марыць пра свабоду гаварыць на сваёй мове, спяваць свае песні, слухаць блізкае, роднае слова сваіх пісьменнікаў. З радасным уздрушэннем выступаў тут кожны паэт, выбіраючы, якія-б самыя задушэўныя і цёплыя радкі прачытаць юным патрыётам радзімы. Выступалі рускі паэт Сцяпан Шчыпачоў, беларускія паэты Пятро Глебка, Аркадзь Куляшоў, Максім Танк, яўрэйскі паэт Бінем Гелер, пісьменнік Эфроім Кагаоўскі, польская пісьменніца Яніна Бранеўская.

Гэтага-ж дня пісьменнікі выязджалі на шклозавод «Нёман», дзе быў наладжан вялікі літаратурны вечар.

У сувязі з 85-годдзем з дня смерці А. Міцкевіча Баранавіцкі абласны выканаўчы камітэт прысвоіў імя паэта польскім сярэднім школам у Баранавічах і Навагрудку, а таксама клубу завода «Нёман». У Навагрудку, на радзіме Міцкевіча, вырашана збудаваць помнік.

В. ЦІМСКІ.

Навагрудак (наш спец. кар.).

КІРАЎ І МАСТАЦТВА

★

С. Дрэйдзен

★

«... Зараз наша соцыялістычная сістэма вядзе смяротнальную барацьбу з капіталістычнай сістэмай. Што гэта значыць? Гэта значыць, што нам трэба ўмець перамагаць не толькі ў вайне, у якой мы безумоўна пераможам, калі нават на нас нападуць заўтра; гэта значыць, што мы павінны перамагаць не толькі на нашых фабрыках і заводах, што мы рабілі і робім, ствараючы новыя гіганты нашага прамысловага будаўніцтва; гэта значыць, што нам трэба не толькі перамагаць у нашай сельскай гаспадарцы, укараняючы новую сучасную тэхніку, тэхніку, якая грунтуецца на апошнім слове навукі, а гэта значыць, што нам трэба перамагаць і ў галіне літаратуры, нам трэба перамагаць і ў мастацтве, нам трэба перамагаць ва ўсіх рашуча галінах ведаў, калі мы сапраўды ўсур'ёз і па-сапраўднаму вырашаем пахаваць капіталізм. А прысягу-ж у гэтым мы далі яшчэ 16 гадоў таму назад», — гаварыў С. М. Кіраў, выступаючы 28 кастрычніка 1933 года на сходзе комсамольскага актыва Ленінграда.

У гэтай барацьбе за новую, соцыялістычную культуру, за новае, соцыялістычнае мастацтва верны вучань і саратнік вялікага Сталіна — С. М. Кіраў даў выдатны прыклад валодання навукай перамагаць, майстэрства сапраўды большэвіцкага кіраўніцтва складанейшымі галінамі культурнага будаўніцтва.

Дружба з мастацтвам, цікавасць да яго, разуменне ўсёй яго велізарнай прапагандысцкай сілы ўзніклі ў Кірава даўно. Яшчэ займаючыся ў падпольным большэвіцкім гуртку ў Томску, юны Кіраў побач з творамі класікаў марксізма-ленінізма, «Капіталам» Маркса і «Што рабіць» Леніна, старанна вывучаў творчасць лепшых прадстаўнікоў рускай рэволюцыйна-дэмакратычнай літаратуры, — імёны Бялінскага і Дабралюбава зрабіліся з таго часу аднымі з самых дарагіх для Кірава.

Да апошняга дня жыцця не перастаючы вучыцца, Кіраў быў шырока адукаваным чалавекам, які сістэматычна чытаў рускую і заходнюю літаратуру, сачыў за жыццём усіх галін мастацтва. Як вядома з біяграфіі Кірава, ён у перыяд прабывання ва Владзікаўказе вёў вялікую падпольную работу, сумяшчаючы яе з супрацоўніцтвам у мясцовай дэмакратычнай газеце «Терек». Старонкі легальнага друку Кіраў умела выкарыстоўваў для яркай публіцыстычнай работы, настойлівага выкрывання сваволі паліцэйскіх улад, адстойвання інтарэсаў працоўных, абароны прыгнечаных нацыянальнасцей. За смелыя артыкулы Кірава рэдакцыя газеты нярэдка падвяргалася штрафам і канфіскацыям.

Рад артыкулаў Кірава ў «Тереке» быў прысвечан і пытанням літаратуры і мастацтва. У гэтых артыкулах Кіраў змагаўся за лепшыя, перадавыя традыцыі рускай рэалістычнай літаратуры, прапагандыраваў класіка пролетарскай літаратуры — Максіма Горкага, рэзка крытыкаваў буржуазныя плыні ў мастацтве, дэкадэнцкі распад, мяшчанства і абывацельшчыну ў самых рознастайных іх праяўленнях. Артыкулы Кірава аб Бялінскім, Горкім, аб Леаніду Андрэеву, рэцэнзіі на пастаноўкі «Гамлета», «Анны Карэнінай», «На дне», на гастролі Давыдава і многія іншыя разам з яго перапіскай з блізкімі, у якой ёсць нямала ўсхваляваных водгукаў па пытаннях мастацтва, даюць дастатковае ўяўленне, якім сапраўдным прыяцелем мастацтва быў Кіраў ужо ў маладосці.

Дасканалае веданне і разуменне мастацтва, апладатворанае ваяўнічай рэволюцыйнай тэорыяй, узбагачанае шырокім культурным кругаглядам і магутным прапагандысцка-арганізатарскім талентам, забяспечыла асаблівую дзейнасць і канкрэтнасць кіраванню Кірава ўчасткам культуры і мастацтва ў годы, калі краіна Советаў перайшла ад баёў грамадзянскай вайны да соцыялістычнага будаўніцтва.

Кіруючы партыйнай арганізацыяй Азербайджана ў 1921—1925 годы, С. М. Кіраў, сутыкнуўшыся са складанейшымі задачамі вырошчвання маладога нацыянальнага мастацтва, соцыялістычнага па зместу, даў цудоўны прыклад прымянення на практыцы вучэння Леніна—Сталіна аб нацыянальнай культуры. Пры непасрэднай падтрымцы Кірава ў Баку быў арганізаван першы азербайджанскі нацыянальны тэатр оперы і балета (цяпер за свае поспехі ў развіцці совецкага мастацтва ўзнагароджаны ордэнам Леніна), выхаваны кадры нацыянальных кампазітараў, артыстаў, мастакоў, пачата сістэматычнае збіранне твораў народнай творчасці. Магутны штуршок для развіцця атрымала і нацыянальная літаратура.

За час работы Кірава ў горадзе Леніна не было літаральна ні адной галіны мастацтваў, прадстаўнікі якой не адчувалі-б жывіцельнага кіраўскага кіравання.

Кіраў нястомна напамінаў, што літаратура, таксама, як і любая іншая галіна культуры, — гэта працэс, якім трэба кіраваць, які можна і трэба арганізоўваць, абапіраючыся на творчую ініцыятыву самых пісьменнікаў, выхоўваючы старыя і маладыя кадры, узбройваючы іх марксісцка-ленінскай тэорыяй.

Ён шматразова адзначаў вялікую ролю друку — выдавецтваў, рэдакцый журналаў, газет — у справе правільнага большэвіцкага накіравання літаратурнага жыцця. Ідэалагічна варожыя творы, спробы выкарыстаць друк для чужой большэвізму прапаганды сустракалі сакрушальны адпор, знішчальную кіраўскую крытыку. І, разам з тым, уважліва падтрымліваючы ўсё найбольш таленавітае ў літаратуры, радасна вітаючы поспехі кожнага совецкага пісьменніка, незалежна ад таго, да якой літаратурнай арганізацыі той належаў, Кіраў выкарыстоўваў увесь свой уплыў, каб забяспечыць шырокае распаўсюджанне лепшым, перадавым творам совецкай літаратуры.

З усёй страснасцю развіваючы мысль, што для пісьменніка няма больш пачэснай задачы, як быць песняром і агітатарам соцыялістычнай рэволюцыі, Кіраў не раз спасылаўся ў якасці прыкладу на ўдалы вопыт пісьменніка Ільіна, кніга якога «Расказ аб вялікім плане», перавыданая ў сотнях тысяч экземпляраў на дзесятках моў, мастацка прапагандыравала вялікі план соцыялістычнага пераўтварэння нашай радзімы.

Нястомную ўвагу ўдзяляў Кіраў самаму масаваму з мастацтваў — кіно. Кіраўскае партыйнае кіраўніцтва вызначыла слаўны шлях Ленінградскай кіностудыі ад «Сустрэчнага» к «Чапаеву» — адной з вяршынь совецкага кіномастацтва. Сам Кіраў з пачуццём сапраўднага захаплення аднёсся к «Чапаеву», прагледзеўшы гэту карціну за кароткі час чатыры разы.

З глыбокім здавальненнем адзначаў ён паварот мастацкага совецкага кіно к паглыбленаму ўвасабленню вобразаў перадавых людзей рэволюцыйнай рэчаіснасці, імкненне мастакоў перадаць у гэтых вобразах вялікія, страсныя партыйныя ідэі. Усяляк падтрымліваючы пераход кінематаграфістаў да сучаснай совецкай тэматыкі, Сяргей Міронавіч у той-жа час указваў на недапушчальнасць павярхоўнага вырашэння актуальных творчых задач, перасцерагаў ад зніжэння ідэйнага ўзроўню кінокарцін, заклікаў да стварэння твораў вялікіх ідэйна-мастацкіх маштабаў, рэалістычнай сілы, партыйнай страснасці і філасофскай глыбіні.

У дакладзе на V абласной і II гарадской Ленінградскай партканферэнцыі 17 студзеня 1934 года Кіраў, цытуючы выказванні Маркса аб сувязі і суадносінах паміж матэрыяльнымі ўмовамі вытворчасці і ўсякага роду ідэалагічнымі надбудовамі, гаварыў:

«Практыка соцыялістычнага будаўніцтва ў СССР раскрывае перад намі ўсю глыбіню гэтага аналізу. Возьмем для прыкладу мастацтва і літаратуру. Глядзіце, якi бурны росквіт маем мы ў гэтых галінах. Пісьменнікі, музыканты, мастакі, кампазітары ўсё актыўней уключаюцца ў агульную справу барацьбы рабочага класа. Растуць новыя таленты з асяроддзя рабочай і калгаснай моладзі, якія пры другім грамадскім ладзе былі-б раздушаны і асуджаны на гібель. Сур'ёзных поспехаў дасягнулі і нашы тэатры як у мастацкіх, так і ў ідэалагічных адносінах».

Як на адну з першайшых задач Акадэмічнага тэатра оперы і балета, які цяпер носіць імя Сяргея Міронавіча, Кіраў указваў на стварэнне своеасаблівага «пантэона» лепшых узораў сусветнага оперна-балетнага рэпертуару (і перш за ўсё нацыянальнага, рускага) у высокамастацкіх пастаноўках і ўзорных выканальніцкіх складах.

Любіцель і знаток класічнай оперы, ён асабліва высока расцэньваў пастаноўку і выкананне «Хаваншчыны» Мусаргскага. На адзін з спектакляў «Хаваншчыны», у якім прымалі ўдзел народныя артысты Ершоў, Андрэеў, Праабражэнская, Сяргей Міронавіч неяк прышоў непасрэдна пасля прагляду новай оперы «Лёд і сталь», якая пакінула ў яго надзвычай адмоўнае ўражанне. Калі нехта заўважыў, што «Хаваншчына» з'яўляецца старым радавым спектаклем, Кіраў сказаў, што варта-б часцей паказваць «такія старыя радавыя оперы», уважлівей вучыцца ў геніяў-класікаў, папулярызіраваць такія вяршыні опернага мастацтва, як «Пікавая дама», «Еўгеній Онегін», «Кармен».

Тым самым зусім не «зачыняліся дзверы» для новай, сучаснай, совецкай оперы, — наадварот, тэатр павінен быў весці ўнутры калектыва сур'ёзную, ініцыятыўную лабараторную работу па стварэнню яе, — але на сцэну Вялікага Акадэмічнага тэатра трэба пераносіць толькі творы высокага якаснага ўзроўню. Найбольш шырока эксперыментальная работа па стварэнню совецкай оперы была пастаўлена — пры шырокай падтрымцы Кірава — у Малым оперным тэатры, які хутка заваяваў славу «лабараторыі совецкай оперы».

Побач са старэйшымі калектывамі спрыяльную ўвагу Кірава з дня ў дзень адчувалі і маладыя рабочыя тэатры, якія асабліва актыўна стваралі сучасны агітацыйна-мастацкі рэпертуар.

Яшчэ ў першыя годы работы ў Ленінградзе С. М. Кіраў, гаворачы аб бурным росце культурных патрабаванняў і інтарэсаў працоўных, аб заваяванні тэатра новымі масамі гледачоў, указваў, што ў недалёкім будучым старая сетка тэатраў і кіно будзе недастатковай, трэба прыступаць да пабудовы новых тэатральных будынкаў.

У адным з успамінаў, якія адносяцца да апошніх год жыцця Кірава, прыводзіцца характэрнае выказванне яго аб музыцы. Загаварыўшы аб Чайкоўскім, аб яго пятай і шостай сімфоніі і «Еўгенію Онегіну», аб 9-й сімфоніі Бетховена (усе гэтыя творы Кіраў слухаў неаднаразова), Сяргей Міронавіч заўважыў:

— Нажаль, нашы совецкія кампазітары яшчэ не стварылі цудоўных твораў, дастойных соцыялізма. А ў параўнанні-ж з будучай герaічнай сімфоніяй, якую павінна стварыць наша эпоха, геніяльная сімфонія Бетховена будзе толькі слабым ценем...

Усякая спроба совецкага мастака падыйсці да мастацкага ўвасаблення асноўных праблем і вобразаў рэволюцыйнай рэчаіснасці знаходзіла прыязную падтрымку Кірава. Пасіўнае «адлюстраванне», бяздушная «алілуйшчына», прыспасабленцкае пустазвонства не маглі яго задаволіць. І з тым большай страснасцю заклікаў ён пісьменнікаў, мастакоў, артыстаў да найвялікшай, самай жорсткай патрабавальнасці ў сваёй рабоце, да творчага асазнання грандыёзнасці задач, якія стаяць перад мастакамі краіны соцыялізма.

Гэтыя задачы былі дасканала сфармуліраваны Кіравым яшчэ ў яго выдатнай, поўнай геніяльнага прадбачання прамове на 1-м з'ездзе Советаў Саюза ССР у 1922 годзе, дзе ён выказаў ідэю стварэння грандыёзнага архітэктурнага помніка эпохі, — Палаца Советаў, прапануючы ўвасобіць у ім «усё, чым багаты совецкія краіны,... усю нашу рабоча-сялянскую творчасць», паказаўшы, як гаварыў Кіраў, што мы «здольны ўпрыгожваць грэшную зямлю такімі помнікамі, якія нашым ворагам і не сніліся».

Словы трыбуна рэволюцыі, натхнёна рысаваўшага контуры гэтага чароўнага палаца ў дні, калі змучаная, акрываўленая краіна, якая толькі што скінула ў моры і акіяны, выкінула за свае кардоны рэшткі армад 14-ці дзяржаў, пачынала залечваць свае раны, — маглі паказацца прыгожай, але далёкай марай. За праміну́ўшыя з таго часу годы совецкая зямля ўпрыгожвалася тысячамі новых цудоўных будынкаў, вуліц, гарадоў, садоў і паркаў. Грандыёзны будынак Палаца Советаў, які вырастае побач са старадаўняй Крэмлёўскай сцяной, будзе высіцца ў ансамблі не старых купецкіх «сарака сарокоў», а новай соцыялістычнай Масквы, рэзка і ўпэўнена змяніўшай сваё аблічча.

Зноў і зноў паўтараў Сяргей Міронавіч словы непахіснай упэўненасці ў тым, што «мы можам упрыгожваць зямлю самымі лепшымі помнікамі мастацтва і пролетарскага зодчаства», і з найвялікшай радасцю адгукаўся ён на кожны факт, які сведчыў аб росце соцыялістычнага мастацтва, росквіце народнай творчасці.

Пры падтрымцы Сяргея Міронавіча ў 1929 годзе ў Ленінградзе была арганізавана і праведзена 1-я алімпіяда мастацкай самадзейнасці, штогодняе правядзенне якой затым увайшло ў традыцыю ленінградскіх профсаюзаў. Сяргей Міронавіч нязменна наведваў алімпіяды, гутарыў з удзельнікамі, дзяліўся ўражаннямі. Магутны эфект рабілі выступленні агульнагарадскога рабочага хора. Хорам дырыжыраваў таленавіты музыкант-масавік, энтузіяст мастацкай самадзейнасці, нязменны «запявала» масавых гулянняў Немцаў, майстэрства і арганізатарскі талент якога Кіраў высока цаніў. З вялікім здавальненнем адзначаў Сяргей Міронавіч выдатную ініцыятыву Немцава па ўцягненню ў калектыўныя спевы шматтысячных натоўпаў народа, якія запаўнялі плошчу Урыцкага ў святочныя першамайскія і кастрычніцкія вечары. «Дзе, у якой краіне яшчэ магчым такі народны хор?» — радасна пытаўся Сяргей Міронавіч.

— Няма людзей, шчаслівейшых за тых, якія называюцца большэвікамі, — не пераставаў паўтараць Сяргей Міронавіч, гаворачы аб шчасці жыцця — барацьбы, жыцця — працы, жыцця — творчасці пад сцягам Леніна—Сталіна. І натхнёнай песняй шчасця прагучалі яго шчырыя, незвычайна задушэўныя і сардэчна сказаныя словы з трыбуны з'езда пераможцаў — XVII з'езда партыі, — словы, якія адгукнуліся звонкім і радасным рэхам па ўсёй нашай краіне:

«Поспехі сапраўды ў нас велізарныя. Чорт яго ведае, калі па-чалавечаму сказаць, так хочацца жыць і жыць. На самой справе, паглядзіце, што робіцца...»

И жизнь хороша,
и жить хорошо!
... А в нашей буче,
боевой, кипучей,
и того лучше!... —

гэтыя радкі лепшага паэта рэволюцыі — Маякоўскага гучалі для Кірава як голас яго асабістага жыццёадчування, як біццё яго ўласнага сэрца.

Бессмяротны вобраз Кірава, герaічны прыклад яго жыцця назаўсёды застанецца для совецкага мастака гарачым заклікам да стварэння твораў, дастойных эпохі Леніна—Сталіна.



«С. М. Кіраў на Астраханскім фронце ў 1919 годзе». Карціна мастака Н. Качэргіна (экспаніравана ў Цэнтральным ваенна-марскім музеі ў Ленінградзе).

Фотарэпрадукцыя Н. Янова (ТАСС).

З Тваім імем у сэрцы

ТАВАРЫШУ СТАЛІНУ

Дарагі Іосіф Вісарыёнавіч!

Мы збіраліся даўна, бацька родны, любімы,
Сказ прынесці Табе ў залатую пару
Пра наш край, як у цемры-няволі жылі мы,
Як з усходу чакалі сваю долю-зару,

Расказаць пра сустрэчу з баявымі сцягамі,
Асвяціўшымі сонцам і зорамі шыр,
Пра вялікую радасць спаткання з братамі,
Пра ўдзячнасць народа Табе, правадыр!

Край наш ворагі розна, як хацелі, так звалі:
«Польшчай», «крэсамі»... Мы перагудамі струн,
Мовай казак і песняў, якія спявалі,
Называлі спрадвеку свой край — Беларусь.

Апавілі наш край і бары і раўніны,
Рэкі выткалі вечны люстраны ўзор,
І пад небам шырокім разаслала краіна
Дываны сенажацяў і сініх азёр.

Нарач пеніцца ў сонцы і прыцішаным громам
Хвалі б'юць, і шумяць, і плывуць у бязмеж,
Налібоцкія сосны ўглядаюцца ў Кромань,
Дрэмле — царства лясное зуброў — Белавеж.

Бачыў Нёман калісьці дзівы-чоўны варагаў
І крывавае сонца ўзорных шчытоў,
Чуў напевы чужыя, і паўночныя сагі,
І цяжкія ўдары крыжацкіх мячоў.

Тут праходзілі шведы, ваявалі французы,
Пусташылі магнаты наш край, каралі,
Ручаямі сплывала ў спякоту і сцюжу
Кроў народа баразнамі гэтай зямлі.

З Каліноўскім ішлі мы супроць ката ў кароне,
Супроць катаў з крыжом і з пятлёй у руках, —
Успаміны тых дзён рэхам песенным звоняць,
У бязыменных народных жывуць курганах.

На абрывах, па ўзгорках ціха дрэмле былое,
Парасло палыном, сівым мохам густым,
І шумяць пад вятрамі небасяжныя хвоі,
Асыпаючы шышак апад залаты.

Пасля зноў загрымела, зямлю рылі снарады,
Аплятаў дрот калючы павуцінием не раз,
І людзей, як калоссе, вайна нішчыла градам,
Засцілаў нівы хваляй удушлівы газ.

Гналі нас у акопы, ў буру, ў шквал ашалелы
Багачы і багі, і цары, і іх зброд,
Каб з крывавых загонаў, каб з магіл анямелых
Як найбольшы сабраць для сябе ўмалот.

Кліknуў Ленін і Ты нас. І за вамі пайшлі мы
Праз Кастрычніка дні, баявыя гады.
І чырвоны сцяг волі палымнеў над радзімай,
Першы раз мы ўбачылі сонца тады!

Але ворагі зноў падпаўзлі, як шакалы,
Волю нашу хацелі ў крыві патапіць,
Ды працоўны народ, устрымаўшы навалу,
Адагнаў іх за межы савецкіх граніц.

Толькі, нас аддзяліўшы, белапольскім наймітам
Не ўдалося згасіць волі нашай зару.
Капытамі таптаді нівы спелага жыта,
Дратавалі Заходнюю Беларусь.

Акапалі граніцай, абцягнулі дратамі,
Каб ніколі і вецер усходні да нас
Прынесці не мог песні, што пяе над палямі,
На свабодных калгасных прасторах вясна.

І паставілі турмы, дзе на сценках і кратах
Мы крывавілі сціснутыя кулакі;
Заганялі ў бажніцы, дзе ў змроку праклятым
Павуцінием аблыталі павукі.

Па дарогах, па спежках, нашай кроўю палітых,
З Острых Брам, з Чэнстахова і з Рыму, як з нор,
Юды ў чорных сутанах, гадаўё-езуіты,
Напаўзалі спрадвеку на гэты прастор.

І крыжом, і нагайкай, і ражанцам, і куляй
Заганялі ў «рай», апалячвалі.
Дзе ішла гэта пошасць, — дрэвы рвала і гнула.
Рэкі гневу народнага бурна плылі.

І расселася шляхта, кулакі і магнаты
З саранчою асаднікаў, катаў, шпікоў;
З арлом белым на нівы, на сялянскія хаты
Наляцела сцярвятнікаў і груганоў.

Захапілі абшары, і лясы, і азёры,
У кіпцюрах застагнала уся старана,
Толькі межы і торбы, палыновае гора,
І пагосты глухія пакінулі нам.

Сотні лепшых байцоў нашай справы народнай
З авангардных калон, з-пад чырвоных сцягоў,
У Свентым Крыжы, Фардоне, у Вільні, Вронках
і Гродне
Адбывалі — каналі дваццаць катаржных год.

Голад гнаў жабракамі нас з роднай краіны,
І не раз батракамі па свеце брылі.
Зналі смагу пампасаў, Уругвай, Аргентыну,
Чорным потам палову зямлі палілі.

Праклiналі мы долю за сахой на палосках,
За сярпом у паноў, за батрацкай касой,
І шумела пустое жытоў нашых калоссе
Над зямлёй пад'ярэмнай, над роднай зямлёй.

За падаткі апошні бралі хлеб і дабытак,
Гналі нас на шарваркі прымушалі, каб мы
Ім шляхі праклалі і, як шчэбнем граніту,
Усцілалі мы вёрсты сваімі касцьмі.

І на захад па рэках, па стальных каляінах
Везлі ноччу і днём мачты нашых лясоў,
Лён шаўковы, насевак, дываны, палатніны —
Маладосць і красу нашых пушч і палёў.

Беспрацоўе ўстрымала ход матораў. З высокіх
Камінoў не ўздымаўся палаючы дым.
Тартакі змоўклі ў Гродне, стаў тэкстыль
Беластока,
Хвалі бунту каціліся праз гарады.

Хвалі з цесных прадмесцяў, з беспрацоўных
кварталаў
Прарывалі кардоны жандармаў, шпікоў,
Пад Кастрычніцкім сцягам мы ішлі, штурмавалі.
Адклікаліся вёскі на кліч гарадоў,

Уставала Палессе, Кобрын, Ліда... Пажары
Ноччу помстай шугалі на стрэхах асад.
За Асташынам, Гродам—хвалі ўспеніла Нарач
Да браслаўскіх рыбацкіх зямлянак і хат.

І заўсёды, калі мы ў барацьбе падымалі
Сцяг чырвоны, Ты быў сярод нас, правадыр!
З Тваім імем ішлі мы, нас яно саграваља
І яно нашы цэментавала рады.

І заўсёды яно нам прызывам гучэла,
За дратамі Картузскай Бярозы, у глыбі
Казематаў лукішскіх, абуджала ў нас смеласць
І палала на нашых сцягах барацьбы.

З Тваім імем вышэй мы ўздымалі галовы,
У крыллях зморaных чулі парыў маладыя,
І ў штурмуючых кроках звінеў поступ сталёвы,
Калі песняй Ты з намі ішоў, правадыр!

Вораг сцягіваў сілы: напаліўшчы дымілі
На разбураных вёсках — ад Карпат да Дзвіны,—
І звінелі кайданы і над краем кружылі,
Усё ніжэй апускаючыся, груганы.

Прадавала народ «Беларуская рада»—
Розпай масці нацдэмы і плоймы шпікоў,—
Прадавалі за злоты, ашуканствам і здрадай,
Пакуль воўчых мы ім не крышылі клыкоў.

Так у жорсткім змаганні, ў паражэннях, ў
парывах,
Быццам вечнасць, цягнуліся нашы гады.
І таму над палямі сумна і сіратліва
Нашы родныя песні звінелі тады.

Іх спявалі за працай непасільнай у хаце,
З ніў чужых жнеі змораныя ідучы,
Іх спявала батрачка, ад калыскі дзіцяці
Адганяючы голад і змрокі начы.

Галасілі яны, калі вецер заходні
Ценем хмар градавых засцілаў старану,
Калі жудаснай смерцю закружылі ў народзе
Весткі чорныя, як крумкачы, на вайну.

Загрымела вайна. Зноў на нівах прыбітых
Пачалі расці горы магіл-курганоў.
Баль апошні спраўлялі шпікі і бандыты,
І ў пагромах лілася нявінная кроў.

Ахінала ноч заравам край наш пакутны,
Толькі верaю жыў беларускі народ,
Што спадуць з рук збалелых іржавыя путы,
І з надзеяй глядзелі мы ўсе на ўсход.

Зналі мы, што пад светам рубінавых зораў,
Як скала непарушны — Савецкі Саюз,
Што Ты, бацька наш Сталін, бачыш нашае гора,
Возьмеш наша жыццё пад ахову сваю.

Будзе ўдзячнасць вякамі цвісці ў пакаленнях,
Будзе жыць вечна ў песнях і сказах той час,
Калі Молатаў нам абвясціў вызваленне,
Выпаўняючы волю Тваю і наказ.

Не ўсхвалюецца Нарач любой навальніцай,
Так не ўспеніцца Нёмана светлы струмень,
Як зайграла ў нас радасць вясёлкай, крыніцай
На свабоднай зямлі ў гэты памятны дзень.

Мы ад радасці плакалі; з хаты у хату
Панеслі гэту вестку, як сонца, як дар,
У імгненне адно—нібы сокал крылаты—
Абляцела яна, ўскалыхнула абшар.

Ёй насустрач выходзілі дзеці малыя,
І старыя дзяды набіраліся сіл.
З хат на прызбы ішлі галубамі сівымі,
Маладосць ім нібы хто вярнуў, васкрасіў.

Расцвілі нашы шэрыя вёскі сцягамі,
Упершыню разагнуў свае плечы народ.
Мы лавілі у небе, на ўсходзе, вачамі
Зоры шчасця, што кожны нам нёс самалёт.

Гул гарматаў і танкаў па дарогах з усходу,
Нібы гром у спякоту, ў ліхі сухавей,
Сокі нёс для палёў, для змарнелай прыроды,
Нёс жыццё для упаўшых у роспач людзей.

А для ворагаў нашых была тая вестка,
Быццам з яснага неба удар перуна,
Апусцілі галовы і рукі павесмам,
Іх, як гадаў, страсала з сябе старана!

Ні байніцы вузкія касцёлаў і вежаў,
Ні акопы, ні дрот ратаваць не маглі
Ад народнага гневу акупантаў-драпежцаў
На чужой, абрабаванай імі, зямлі.

Па-святочнаму, нашы прыбраліся хаты,
Жоўталісце гарэла ў вішнёвых садах.
Сабіраліся хлопцы, мужчыны, дзяўчаты,
Грамадой на шырокі выходзілі шлях

Сустракаць сваіх родных, жаданых, чаканых,
Якіх дваццаць гадоў дачакаць не маглі,
Расчыніць ім шырока гасцінныя брамы,
Да грудзей усхвалёваных іх прытуліць.

І спыняліся танкі, як цуды паданняў,
Як асілкі у казках тваіх, Беларусь!
Колькі светлых хвілін, незабыўных спатканняў
Гэты дзень нам прынёс—не апець песняру!

Вось брат брата спаткаў пасля доўгай разлукі,
Бацька сына спаткаў, сястра брата знайшла,
І шаптала бабулька: «Унукі, унукі...»
А унукаў сваіх і злічыць не магла:

Украінец і рускі, і сын Грузіі стройны,
І бялявы карэл, і кіргіз, і узбек,
Кожны ўнукам ёй быў самым любым і родным,
Нам быў братам па працы і барацьбе.

Абвілася матуля, як хмель, каля сына,
Валасы прыгалубіла ціха рукой,
Абняла за сябе, за братоў, за радзіму,
Абліла сваёй першай шчаслівай слязой.

Люд рабочы з астрогаў, з падвалаў глыбокіх
Беласток і Гродна, — пляцы заліваў.
І грымеў першы раз пераможна, высока
Над мурамі дамоў Інтэрнацыянал.

Адзывалася рэха ў руінах і сходах
Старых замкаў, трывожачы прах ваявод.
Стромкім вежам ніколі такога пахода
Не здаралася бачыць, як гэты паход!

Ткач высокі, худы—ад гадоў беспрацоўя,
Маладая работніца — смелай рукой, —
Сцяг паўстанцаў няслі, зліты потам і кроўю,
На сустрачу свабодзе жаданай сваёй.

Яны чулі, што ў грохаце танкаў, у кроку
Кожнай роты, у цокаце звонкіх падкоў
Ідзе праца у фабрыкі іх Беластока,
Ідзе хлеб у застолле рабочых дамоў.

На прызыў Беластока—на сход усенародны
Ад станка і сахі людзі працы ішлі,
Каб абраць, як жыць на прасторах свабодных,
На прасторах шчаслівай і роднай зямлі.

Дзевяцьсот дваццаць шэсць было ўсіх дэпутатаў.
А за імі—пяцімільённы народ,
Сустракаліся разам калісь на этапах,
А цяпер іх краіна пазвала на сход.

І ніхто і ніколі не зможа у слове
Перадаць усю веліч шчаслівага дня,
Бо Ты жыў ў нашых сэрцах і ў кожнай прамове
Адчувалася мудрая воля Твая!

Тваё імя ўздымалася бурай авацый,
Палымнела на лозунгах нашых агнём.
Цябе славілі ўсе мы без розніцы нацый,
Цябе славілі новым, свабодным жыццём!

І на сходзе тады мы зацвердзілі права
Назаўсёды свабодных, працоўных людзей,
Што ніколі бандытам і катам крывавым
Не дадзім рабаваць нашу працу ніdзе.

Каб мінулае зноў не закула радзімы,
Каб мы зноў не блудзілі па сцежках глухіх, —
Парашылі прасіць Цябе, родны, любімы,
Каб прыняў нас да вольных народаў сваіх.

Павязлі сваю просьбу мы ў сэрца айчыны,
У Маскву, да Цябе, дарагі, павязлі!
І свабодна віліся дарог каляіны,
Не дзяліла мяжа болей роднай зямлі.

А Масква прыняла нас, як матка прымае
Сваіх родных і доўгачаканых дзяцей.
Расцвілі яе плошчы і вуліцы маем,
Хвалявалася мора сцягоў і людзей.

Тут з Саюзам Савецкіх Рэспублік навекі,
Як зліваюцца рэкі, зліліся і мы,
Каб пад мудрай Тваёй і магутнай апекай
Да вялікіх падзей нашы крочылі дні.

Аглядалі мы дзівы ўсесаюзнай сталіцы,
Як пад сталінскім сонцам яна расцвіла!
Бараніць на захадзе Саветаў граніцы
Прысягалі рубінавым зорам Крэмля,

Аблажыць прысягалі граніцы бетонам,
Каб ні сілай, ні хітрасцю вораг не змог
Перайсці праз свяшчэнныя рысы кардона,
Каб Радзіма Працоўных расла без трывог.

Ля Крэмлёўскай сцяны у граніце чырвоным
Спіць вялікі Ільіч, наш настаўнік і друг.
Мы з пашанаю ціхай складаем паклоны
І ўдзячнасць народа правадыру.

Знаем мы, што Ільіч не памёр, што ён з намі,
Бо, зямлю азараючы і маўзалей,
Палымае узнятае Сталіным знамя,
Знамя ленінскіх — вечных і мудрых — ідэй.

Мы ў Крэмлі, у Саюзным Вярхоўным Савеце...
На вачах гэта ява, як казачны сон!
Гэта самы народны парламент на свеце,
У ім праца—ўладар і адзіны закон.

Ты прымаў нас так шчыра і проста, і ветла,
Грамадзянствам савецкім наш край абдарыў,
Усміхнуўся, вітаючы цёпла і светла,
І, як бацька, з сваімі дзяцьмі гаварыў.

Панеслі мы ў сэрцах, нібы праменны ранак,
К берагам ціхай Прыпяці, гулкай Дзвіны
Нашу ўдзячнасць Табе й невымоўную радасць
Аб'еднанай навекі Табой стараны!

Беларусь наша маці, нас малых гадавала
Ты на хвалях сваіх даспяваючых ніў,
Спевам жней паднявольных, нас — дзяцей
калыхала,
Болем, жалем, тугой спавівала нам дні!

Што было—прамінула! Сёння ў вольнай краіне
Вырывае народ асаты і трысцё.
Мазалістай рукой дзень па дню, па гадзіне
Ператрэ, ператворыць ён былое жыццё.

На балотах туманных, па пясчаным Палессі
Абрусом жоўтатканым мы пасцелем жыты,
Будзем сеялкай сеяць лён, пшаніцу ў тым месцы,
Дзе шумелі з густым лазняком чараты.

А з шырокіх балот пырсне сонцам багацце —
Торф, які мы вякамі дастаць не маглі,
Ён шчаслівую долю нам асвеціць у хаце,
Будзе сілай маторнай для нашай зямлі.

Днепра-Бугскі канал правялі мы ў Палессі.
Праз яго нашы рэкі гутораць з Дняпром,
І на хвалях плывуць нашы новыя песні,
Караблі праплываюць з народным дабром.

Беспрацоўе, як здань, адляцела навекі,
Зямля нашаю стала, праца ў нашых руках.
Разгуліся заводы для дабра чалавека,
Усё шырчэй і шырэй нашай працы размах.

Назаўсёды мінулі непатрэбныя спрэчкі
Розных нацый на нашай беларускай зямлі,
Больш ніхто не пасварыць, словам злым не
скалечыць
Нас—народаў вялікай савецкай сям'і!

Быў наш край без дарог. Бездарожжа заўсёды
Чорным змеем паўзло па дрыгве, на вадзе,
Зараз вольны народ ад заходу да ўсходу
На ажыўшых разлогах шляхі правядзе.

Пад зарой Канстытуцыі ззяе краіна,
Набіраецца сілы з'еднаны народ,
Чалавекам пачулася наша жанчына,
У працы новай чуцён яе творчы палёт.

У гарадах і па вёсках пабудованы яслі,
У палацы былым, у магнацкім двары,
Серабрысты, вясёлы, як ранак той ясны,
Смех дзяцей там звініць ад зары да зары.

Ты дзяцінства сапраўднае даў нашым дзецям,
Перад імі — усё, што ў жыцці можна мець!
Не адзін з іх калісь Тваё імя па свеце
Як штандар баявы ў барацьбе панясець!

І з усіх нашых думак, з гулкіх струн баяністаў,
З вольнай хвалі, ўсплываючай на берагі,
З кожнай іскры вачэй, вачэй шчырых і чыстых,
Мкне любоў да цябе, правадыр дарагі!

У сэрцы будзем насіць несканчоныя годы
Нашу ўдзячнасць за тое, што нам падарыў:
За з'еднанне ў адзіную цэласць народа,
За святло, якім будучыню азарыў!

І за партыю нашу, што вядзе пад сцягамі
Па шляху перамог вёскі і гарады,
Што узняў наш народ, каб лятаць сакаламі
У Тваёй сакалінай сям'і, правадыр!

Будзем славіць Цябе за жыццё маладое,
Што ідзе па зямлі залацістай сяўбой,
За вялікую радасць быць заўсёды з Табою,
Да вяршынь комунізма ісці за Табой.

Паэты заходніх абласцей БССР:
Філіп ПЕСТРАК, Максім ТАНК, Міхась МАШАРА. Паэт — Міхась КЛІМКОВІЧ.

Падрыхтоўка да выбараў у мясцовыя Саветы дэпутатаў працоўных у Заходніх абласцях БССР

ПІСЬМЕННІКІ—КАНДЫДАТЫ Ў ДЭПУТАТЫ

Працоўныя гор. Гродні вылучылі у дэпутаты Беластоцкага абласнога Савета кандыдатуру беларускага паэта Філіпа Пестрака.

У панскай Польшчы нездарма праследаваліся яго агнявыя вершы, а самога паэта паны больш 11 год трымалі ў сырых турэмных сутарэннях. Ф. Пестрак быў заўсёды верным сынам беларускага народа, ён аддаваў усе свае сілы, здольнасці, творчасць справе барацьбы за вызваленне працоўных з-пад ярма польскіх капіталістаў і памешчыкаў. Вось чаму яго вершаў як агню баялася польская панства, ворагі рэвалюцыі. Паэт прайшоў цяжкі, шматпакутны шлях, але ён ніколі не згінаў пакорліва плячэй. Вершы Ф. Пестрака выходзілі праз турэмныя краты, будзячы свядомасць народа, загартоўваючы яго волю да перамогі.

Толькі цяпер, на вызваленай зямлі, заспяваў паэт поўным голасам. Нядаўна вышла кніга яго вершаў «На варце», якую з цікавасцю будуць чытаць працоўныя. Гэта—кніга пра несакрушальную магутнасць людзей, якія аддаюць усе свае сілы справе рэвалюцыі, справе партыі бальшэвікоў.

Ф. Пестрак адным з першых сярод заходнебеларускіх паэтаў прынят у члены Саюза савецкіх пісьменнікаў і выбран старшынёй бюро беластоцкага аддзялення ССП. Яго талент атрымаў усе магчымасці натхнёна тварыць на карысць народа, на карысць сваёй радзімы, аб якой ён доўгія годы марыў у турэмных засценках, змагаўся ў рэвалюцыйным падполлі.

У часе выбараў 24 сакавіка гэтага года працоўныя Гродненшчыны аднадушна выбралі Ф. Пестрака дэпутатам у сацыялістычны парламент — Вярхоўны Савет СССР. Гэта вялікае давер'е тав. Пестрак апраўдвае сваёй напружанай паўсядзённай работай. Да свайго дэпутата прыходзяць рабочыя, калгаснікі, служачыя і ўсе яны знаходзяць у ім чулага, сардэчнага і простага таварыша, у якога няма іншых інтарэсаў, апрача інтарэсаў народа. Таму і на гэты раз працоўныя Гродні быць іх дэпутатам, іх пасланцом у абласным Савеце давяраюць Ф. С. Пестраку.

На сваім агульным сходзе пісьменнікі Беластока ў дэпутаты гарадскога Савета вылучылі кандыдатуру вядомага беларускага паэта Максіма Танка.

Усе выступаўшыя на гэтым сходзе пісьменнікі гаварылі аб тым радасным адчуванні, якое яны перажываюць, вылучаючы сваіх кандыдатаў у дэпутаты органаў улады. Усім яшчэ памятна недалёкае мінулае, калі яны, бяспраўныя і загнаныя, і думаць не маглі пра свой уплыў у кіраўніцтве дзяржавай. Каб выпусціць у свет твор, трэба было самому сабраць сродкі на выданне, самому потым распаўсюджваць яго, хадзіць па кватэрах, прасіць каб купілі тваю кнігу. Цяпер акружаныя клопатамі комуністычнай партыі і Савецкай улады, пісьменнікі Беластока пішуць свае творы, ведаючы, што іх з цікавасцю чакае савецкі народ. Свае новыя кнігі беларускія, польскія і яўрэйскія пісьменнікі выдаюць у маскоўскім і мінскім дзяржаўных выдавецтвах.

З узрушаным пачуццём, з хваляваннем абмяркоўвалі пісьменнікі, каму даручыць свае паўнамоцтвы, каго паслаць у мясцовыя органы ўлады. Тав. Крысько прапануе вылучыць кандыдатам у дэпутаты гарадскога Савета ад пісьменніцкай арганізацыі Максіма Танка, аднаго з лепшых паэтаў савецкай краіны, страснага сучасніка, песняра нашай гераічнай эпохі.

— Радасна бачыць і адчуваць,—гаворыць тав. Крысько,—што такі паэт, чалавек празрыстай душы, гарачага і чыстага сэрца жыве, працуе і творыць у нашым асяроддзі, выхоўвае і вучыць нас сваёй творчасцю.

Прапанова тав. Крысько горача падтрымоўваецца тт. Кагаtоўскім, Г. Смолярам і ўсімі прысутнымі.

Першыя вершы М. Танка былі надрукаваны ў турэмным літаратурным беларускім журнале «Краты» у Вільні, у Лукішскім астрозе, дзе паэт сядзеў за рэвалюцыйную дзейнасць. Пасля турмы М. Танк ідзе на падпольную комсамольскую работу сярод маладой інтэлігенцыі, сярод працоўнай моладзі. Бачачы, як хутка развіваецца, расце і дужэе вялікі талент паэта, які гарачы водгук знаходзяць яго творы сярод народа, буржуазныя напыяналісты, лакеі польскіх паноў, пераканаўшыся ў тым, што ім не запалохаць, сілаю не зламаць рашучасці паэта, пачалі дзейнічаць іначай. Яны прапанавалі М. Танку паехаць за граніцу, паступіць ва ўніверсітэт, каб тым самым звязаць яго дзейнасць, адарваць яго ад рэвалюцыйна-вызваленчага руху. Але М. Танк адказаў на гэтыя плугні напыяналістаў яшчэ большай палітычнай актывізацыяй. У сваіх знішчальных саркастычных вершах паэт адкрыта прарочыў усім ім скорую пагібель.

Сход аднагалосна пастанавіў вылучыць кандыдатуру тав. М. Танка ў дэпутаты гарадскога Савета.

Паэт Б. Гелер уносіць прапанову вылучыць кандыдатам у дэпутаты гарадскога Савета адказнага сакратара бюро ССП тав. Г. Смоляра. Прапанова падтрымана ўсімі пісьменнікамі. Выступаўшыя тт. Дрэер, Жыцман, Равіч, Найтус, Кагаtоўскі, Марк ахарактарызавалі тав. Смоляра як энергічнага, працаздольнага таварыша, умелага арганізатара, вопытнага партыйнага работніка, які ва ўмовах панскай Польшчы шмат сіл і здольнасцей аддаў змаганню за вызваленне працоўных з-пад ярма акупантаў, справе арганізацыі і выхавання рэвалюцыйных пісьменнікаў.

Даверанымі па кандыдатуры тав. Танка сход абраў П. Крысько, па кандыдатуры тав. Смоляра—Л. Рыхтэра.

Беласток (наш кар).

Артыст Яцэк Вашчэровіч

У варшаўскім тэатры Шыфмана ішло «Вяселле» Выспянскага. На галёрцы сядзеў юнак, які прагна сачыў за сцэнай. Гэта быў гімназіст Яцэк Вашчэровіч, які за сто кіламетраў прыехаў у Варшаву, каб трапіць на спектакль: у павятовым горадзе Седлец, дзе ён жыў, не было тэатра.

Яшчэ на школьнай парце прабудзілася ў Яцэка цікаўнасць да тэатральнага мастацтва. Ён чытаў тэатральныя рэцэнзіі, вечарамі праседжваў над п'есамі. Любоў да тэатра разгарэлася з новай сілай, калі Вашчэровіч пераехаў у Варшаву: у 1922 годзе ён паступіў на юрыдычны факультэт Варшаўскага універсітэта. Ужо будучы на трэцім курсе, ён сумяшчае універсітэцкую вучобу з вучобай у школе тэатра «Рэдута», а хутка зусім пакідае універсітэт і прысвячае сябе тэатру.

1926 і 1927 годы Яцэк Вашчэровіч працуе ў тэатры «Рэдута», які гастраліраваў у Вільні і Гродні. Ён выконвае невялікія ролі, пераважна камічнага характару. У гэты час у тэатр пранікаюць тэатральныя плыні з Савецкага Саюза і малады артыст становіцца іх гарачым прыхільнікам. Разам з групай найбольш прагрэсіўных актораў ён пакідае тэатр «Рэдута» і стварае тэатр «Новая сцэна». У гэты час абсталёўваецца будынак тэатра «Атэнеум»—у доме чыгуначнікаў. Саюз чыгуначнікаў прыхільна сустрэў новую акторскую трупу і прадаставіў ёй памяшканне свайго тэатра. З вялікім поспехам тэатр ставіць «Швейка», «Вяселле Фігаро» і інш.

У 1932 годзе Яцэк Вашчэровіч працуе акторам у Львове. Тут ставяцца «Дзяды» Міцкевіча, творы Шэкспіра.

З 1935 па 1939 год Вашчэровіч працуе ў варшаўскім тэатры Шыфмана, а таксама здымаецца ў кінофільмах. Пазнаёміўшыся з Аляксандрам Венгеркам яшчэ ў 1929 годзе ў Лодзі, Вашчэровіч цесна збліжаецца з ім у 1935 годзе—іграе ў трох п'есах, пастаўленых Венгеркам.

Артыст Вашчэровіч увесь час цягнецца к савецкаму тэатральнаму мастацтву. Яшчэ ў 1932 годзе яму ўдаецца набыць кнігу Станіслаўскага «Маё жыццё ў мастацтве».

Калі ў памятныя верасеўскія дні 1939 года гераічная Чырвоная Армія рушыла ў вызваленчы паход у Заходнюю Беларусь, артыст Вашчэровіч не задумваючыся пакідае Варшаву і ідзе насустрач Чырвонай Арміі.

Зараз Яцэк Вашчэровіч—адзін з лепшых артыстаў Дзяржаўнага польскага тэатра БССР. У спектаклі «Каварства і любоў» Шылера ён стварыў таленавіты вобраз Вурма—сакратара прэзідэнта. У адрозненне ад традыцыйнага паказу Вурма цалкам «чорным характарам», Вашчэровіч паказвае, што Вурму не чужды чалавечыя пачуцці, а на подлыя злачынствы яго штурхае сацыяльнае становішча і ўродлівы лад, якому ён служыць.

У «Пажыццёвым» Фрэдра Вашчэровіч іграе галоўную ролю —скупога Латку. Тут ва ўсім харастве праявілася яго майстэрства пераўвасаблення. Вашчэровіч паказаў сябе таленавітым акторам.

У падрыхтоўваемай зараз тэатрам «Аптымістычнай трагедыі» Вішнеўскага Вашчэровіч іграе цяжкую ў сэнсе бедгасці драматургічнага матэрыялу ролю Фіна Вайнонека. Гэту ролю Вашчэровіч лічыць найбольш адказнай з усіх сыграных ім роляў.

Натхнёна творачы на карысць сацыялістычнай радзімы, тав. Вашчэровіч адчувае сябе роўнапраўным савецкім грамадзянінам, прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці. Ён з'яўляецца старшынёй мясцкома тэатра. У часе выбараў у Вярхоўныя Саветы СССР і БССР тав. Вашчэровіч быў членам участковай выбарчай камісіі ў Гродні, зараз—член гарадской выбарчай камісіі па выбарах у Беластоцкі гарадскі Савет. Пад кіраваннем тав. Вашчэровіча наладжваліся шэфскія канцэрты для прызыўнікоў, для дзяцей і г. д.

Працоўныя Беластока вылучылі Яцэка Войцэхавіча Вашчэровіча кандыдатам у дэпутаты Беластоцкага абласнога Савета дэпутатаў працоўных.

Беласток. Т. ЛЯСОВІЧ.



Мастацкая самадзейнасць у Чырвонай Арміі. Джаз-аркестр Н-скай часці Зах.АВА пад кіраваннем капельмейстара Р. М. Гомана развучвае новыя савецкія песні.
Фотахроніка БелТА.

Акад. С. Я. Вальфсон

Энгельс—вялікі пролетарскі гуманіст

Вялікі асновапаложнік навуковага камунізма Фрыдрых Энгельс удзеляў у сваіх думах і работах асобнае месца пытанням пролетарскага гуманізму.

Жывы чалавек заўсёды стаяў ў цэнтры ўвагі Энгельса. Энгельс ненавідзеў капіталістычны лад таму, што гэта лад усебаковага прыгнечання чалавечай асобы, лад, які трымаецца на эксплаатацыі чалавека чалавекам, які падаўляе чалавека. Энгельс паказвае, як парабашчае чалавека прыватная ўласнасць, як яго уродуе сям'я класавага грамадства, як яго трымае ў палоне капіталістычная дзяржава, як яго калечыць разрыў паміж фізічнай і разумовай працай, як яго прытупляе капіталістычная фабрыка, як яго разбэшчвае капіталістычная канкурэнцыя, як яго дэмаралізіруе галеча, як яго душыць нацыянальны ўціск, як яго атупляе рэлігія... Капіталістычнае грамадства разглядалася Энгельсам як папаванне ўсеагульнага і ўсебаковага парабашчэння асобы.

Як сапраўдны пролетарскі гуманіст, Энгельс ведаў, што з капіталістычнага рабства ў новае грамадства ёсць толькі адзіныя дзверы—дыктатура пролетарыята, адна дарога—сацыялістычная рэвалюцыя. Ён аддаваў самыя высокія ўзлёты свайго навуковага прадбачання, самыя геніяльныя пабудаванні сваёй творчай думкі характарыстыцы бяскласавага сацыялістычнага грамадства, з уступленнем у якое згарбачаная пад уціскам класавай эксплаатацыі чалавечая асоба скіне з сябе груз уціску і выпраміцца на ўвесь свой горды чалавечы рост...

Машына пры капіталізме робіць чалавека прыдаткам да сябе, «частковым індывідуумам». Пры сацыялізме чалавек зробіць машыну магутным сродкам панавання над светам і падпарадкавання сабе прыроды.

Капіталізм робіць жанчыну сродкам асалоды, прыладай дзетанараджэння, прастытуткай. Пры сацыялізме яна становіцца свабодным чалавекам, роўным мужчыну, гераіняй працы. З якой гордасцю гаварыў Энгельс аб тым, што ў камуністычным грамадстве «вырасце новае пакаленне: пакаленне мужчын, якім ніколі ў жыцці не прыходзілася купляць жанчыну за грошы, альбо іншыя сацыяльныя перавагі, і пакаленне жанчын, якім ніколі не прыходзілася аддавацца мужчыне з-за якіх-небудзь іншых пабуджэнняў акрамя кахання...» («Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы», (стар. 51).

Капіталізм замыкае чалавека ў клетку вузкай прафесіі. Пры сацыялізме знішчаецца гэты вузка-абмежаваны прафесіяналізм, асоба робіцца гарманічнай, спалучаючай работу ў розных галінах, куды яе цягне інтарэс і здольнасці.

Пры капіталізме непазбежна нацыянальнае прыгнечанне, існаванне нацый пануючых і падпарадкаваных. Сацыялізм знішчае ўсе віды нацыянальнага прыгнечання і прывілегій, нараджае інтэрнацыянальную салідарнасць, інтэрнацыянальнае братэрства працоўных.

Энгельс ставіў усе свае ісполінскія здольнасці на службу рабочаму класу, на службу партыі. Бязмежная адданасць пролетарскай рэвалюцыі прымушала Энгельса аддаваць дзесяцігоддзі свайго жыцця «сабачай камерцыі» для таго, каб такім шляхам забяспечыць Марксу магчымасць выкаваць для рабочага класа бессмяротную і пераможную зброю «Капітала».

Да канца дзён сваіх Энгельс нёс сваю верную службу рабочаму класу, ні разу не дрогнуўшы, ні разу не адступіўшы, ні разу не сагнуўшыся.

Барацьбу за справу рабочага класа Энгельс зрабіў сваім жыццёвым прызваннем, гэтай барацьбе аддаў ён сваё жыццё. Ён адышоў з жыцця горды сваёй барацьбой і ўпэўнены ў канчатковай перамозе. Калі смерценосныя шчупальцы рака схапілі яго за горла, Энгельс піша словы, прасякнутыя невычарпальным аптымізмам пролетарскага рэвалюцыянера:

«Паўсюды прыгнечаныя змыкаюць свае рады і праз межы сваіх краін працягваюць адзін другому рукі. Інтэрнацыянальная пролетарская армія арганізоўваецца і выстройваецца, і пачатак новага стагоддзя будзе сведкай яе перамогі». (З артыкула для італьянскай газеты «Ла Рыскосса»).

Энгельс быў выключна рознабаковай і шматграннай натурай—барацьбіт і мысліцель, арганізатар і тэарэтык, стратэг і вучоны, барыкадны баец і даследчык першабытнасці, выдатны спартсмен і танчэйшы літаратуразнавец, крытык Гельмгольца і знаўца Шэкспіра, выдатнейшы тэарэтык вайсковай справы, празваны «генералам», і вялікі філосаф—адзін з асновапаложнікаў дыялектычнага матэрыялізма...

Недарма Энгельс з такой вялікай сімпатыяй адносіўся к вялікім гістарычным фігурам Адраджэння, вылучаным маладой узыходзячай буржуазіяй, ён называў іх тытанамі.

Аб Энгельсу можна таксама сказаць, што ён быў тытанам па рознабаковасці і вучонасці, па паўнаце і сіле характару. Але, вядома, гэта рознабаковасць прынцыпова іншай, больш высокай якасці. Энгельс настолькі вышэй за вялікіх людзей Адраджэння, наколькі ўзыходзячы рабочы клас вышэй маладой буржуазіі—на сваіх канчатковых мэтах, па гістарычнай ролі, якую ён заклікан адыграць. Рознабаковасць Энгельса і яго, так сказаць, інтэлектуальная адгукліваєць здзіўляюць. Пытанні першабытнай экзагаміі і навейшыя геалагічныя тэорыі, пытанні хіміі і літаратуры, матэматыкі і філалогіі, дыялектыкі прыроды і дыялектыкі гісторыі—усё гэта трывожыць энцыклапедычны розум Энгельса, узбуджае даследчыцкую цікавасць. Нейкая ненасытная прага ведаў, якая не ведае перашкод на сваім шляху!..

Праўда, Энгельс дазваляе сабе іншы раз паскардзіцца, што «калі маеш за сабою 70 год, дык Мейпертаўскія асацыяцыйныя валокны мозгу працуюць з нейкай фатальнай паволнасцю». Але ўсё-ж на восьмым дзесятку год ён, свабодна валодаючы дзесяццю мовамі, бярэцца за вывучэнне адзінаццатай —нарвежскай,— трэба прачытаць Ібсена ў арыгінале, а далей, на чарзе—румынская. І ўсё гэта пры пастаянным удзеле ў міжнародным рабочым руху ў самай гушчы яго практычных і арганізацыйных пытанняў.

У сваёй вядомай жартаўлівай споведзі Маркс на пытанне аб яго любімым выслоўі адказаў: «Нішто чалавечае мне не чужда». Гэтыя словы былі і жыццёвым дэвізам Энгельса. Энгельс любіў жыццё моцна і ўмеў чэрпаць з усіх яго крыніц. Ён ненавідзеў ханжаў і ліцамераў, слова «філістэр» было найгоршай лаянкай на яго мове. І калі ён назірае пранікненне елейнай мяшчанскай маралі ў пролетарскае асяроддзе, гэта выклікае ў ім трывогу і абурэнне. Паказальны ў гэтых адносінах артыкул Энгельса аб Веерту.

Няма ніводнай формы падаўлення чалавечай асобы, адносна якой Энгельс не паказаў-бы магутнага разнявольваючага і вызваляючага ўплыву на яе сацыялізма.

На ўласным прыкладзе свайго слаўнага і мужнага жыцця паказаў Энгельс узор новага чалавека. Глыбокае навукова абгрунтаванае перакананне ў вялікай сусветна-гістарычнай ролі, якую заклікан адыграць пролетарыят, было для Энгельса незамянімай крыніцай яго гарачай рэвалюцыйнасці, яго неўкрацімага рэвалюцыйнага натхнення.

Пагарда да абывацеля-філістэра, нянавісць к ворагу, бязлітаснасць к праціўніку спалучаліся ў Энгельса з любоўю к таварышу, к саратніку і таму, хто змагаецца за вялікую справу рабочага класа. Бязмежная адданасць Энгельса Марксу з'яўляецца класічным узорам таго, чым з'яўляецца **сацыялістычная** дружба.

«Старажытныя паданні,—пісаў Ленін у сваім некралогу аб Энгельсу,—расказваюць аб розных чуллівых прыкладах дружбы. Еўрапейскі пролетарыят можа сказаць, што яго навука створана двума вучонымі і барацьбітамі, адносіны якіх перавышаюць самыя чуллівыя паданні старажытнасці аб чалавечай дружбе» (В. І. Ленін. «Фрыдрых Энгельс», т. І, стар. 412).

Я назваў глыбокую дружбу Энгельса з Марксам узорам **сацыялістычнай** дружбы таму, што іх саюз быў пазбаўлен малейшых элементаў асабістай карыслівасці альбо інтарэсу. Іх дружба цалкам грунтавалася на адданасці пролетарскай рэвалюцыі, у аснову яе былі пакладзены рабочы клас і яго партыя, сумесная і неразрыўная барацьба за сацыялізм.

Характарыстыка асобы Энгельса была-б няпоўнай, калі-б мы не ўпамянулі пра такую рысу гэтага гіганта, як яго незвычайная скромнасць. Таварыш Сталін не дарма заўсёды вылучае гэту рысу, як адну з важнейшых якасцей комуніста.

Энгельс не толькі адводзіў сабе ролю «другой скрыпкі» пры Марксу, але з асаблівай энергіяй і настойлівасцю адхіляў усе знакі ўвагі, якімі пасля смерці Маркса міжнародны рабочы рух узнагароджваў свайго адзінага інтэрнацыянальнага правадыра.

Калі ўшаноўвалі яго 70-годдзе, Энгельс заяўляў: «Я-ж толькі збіраю жніво са славы Маркса». Калі яго з захапленнем віталі, ужо незадоўга да яго смерці (Цурыхскі кангрэс Інтэрнацыянала), ён прымаў гэта прывітанне «толькі як супрацоўнік вялікага чалавека»... Такім быў Энгельс, гігант рэвалюцыйнай мыслі і рэвалюцыйнай справы, які сваім выдатнейшым жыццём даў правобраз сацыялістычнага чалавека.


Духоўная спадчына Энгельса — невычарпальная крыніца ідэйнага ўзбагачэння і тэарэтычнага ўзбраення рабочага класа. На кнігах Энгельса «Анты-Дзюрынг», «Паходжанне сям'і, прыватнай уласнасці і дзяржавы», «Становішча рабочага класа ў Англіі», «Людвіг Фейербах» — раслі і выхоўваліся тысячы рэвалюцыянераў царскай Расіі. Гэта тыя універсітэцкія курсы, на якіх яны праходзілі навуковы комунізм. На гэтых кнігах, побач з бессмяротнымі творамі Маркса, узнімаўся да вяршынь велізарнейшых абагульненняў марксізма-ленінізма геній Владзіміра Ільіча Леніна. Убіраў у сябе іх змест, расправаўляючы свае магутныя крыллі, малады Сталін. Энгельс для нас не вялікі мярцвец, не велічны цень гістарычнага мінулага. Ён жывы, наш геніяльны старык, наш бяссмертны настаўнік.

Гэта па мудрых і баявых радках яго «Анты-Дзюрынга», па яго работах «Рэвалюцыя і контррэвалюцыя ў Германіі», «Сялянская вайна ў Германіі», па яго артыкулах аб грамадзянскай вайне ў США, аб франка-прускай вайне вывучаюць тактыку пролетарскай барацьбы ў надыходзячых войнах загнаныя ў глыбокае падполле геройчныя барацьбіты компартый імперыялістычных краін. Там, дзе лютуюць псы і свінні сусветнай рэакцыі, барацьбіты комуністычнага падполля па творах Энгельса, побач з работамі Маркса—Леніна—Сталіна, вучацца змагацца і перамагаць...

Сацыялістычнае грамадства мыслілася Энгельсам як пачатак сапраўднай, вартай чалавека гісторыі, як пачатак новай эры ўсебаковага і гарманічнага чалавека. Ён ведаў, што тысячагоддзі да сацыялістычнай эры з'яўляюцца доўгім і пакутным перыядам чалавечага рабства, поўжывёльнага гібення людзей, уціску і мучэнняў, царства сляпой і жорсткай неабходнасці. Ён ведаў, што толькі сацыялістычная рэвалюцыя нясе чалавецтву «скачок у царства свабоды».

Заканчваючы свой слаўны і доўгі жыццёвы шлях, Энгельс ведаў, наколькі чалавецтва наблізілася да гэтай заветнай мэты — самай натхняючай з усіх магчымых на зямлі. Яго думы і справы нязмерна наблізілі нас да мэты, «яшчэ ні разу не ажыццяўляўшайся на працягу ўсёй гісторыі свету». (Пісьмо к Лемпло. «Большэвік» № 14, 1935, стар. 117). І таму мы, якія маем шчасце жыць у эпоху ажыццяўлення заветнай мэты, аб якой марылі лепшыя галовы чалавецтва, з асобай радасцю і падзякай успамінам мыслі, справы і дні Фрыдрыха Энгельса.

Геніяльная мудрасць энгельсаўскіх радкоў яшчэ шмат чым паслужыць сусветнаму пролетарыяту ў прадстаячых баях за канчатковую перамогу комунізма. І таму на сцягу, з якім армія пролетарыята ўсяго свету будзе весці свае апошнія і рашучыя баі, гарыць заклікаючым і натхняючым сімвалам імя з вялікай плеяды геніяльных пролетарскіх правадыроў — Маркса— Энгельса—Леніна—Сталіна.



Фрыдрых Энгельс. Скульптура засл. дзеяча мастацтваў БССР **З. Азгура** (экспаніравана на выстаўцы «Ленін і Сталін—арганізатары БССР»).

Фота І. Каплінскага.

Заключны тур агляду тэатраў для дзяцей

У Маскве прайшоў заключны тур Усесаюзнага агляду тэатраў для дзяцей. Перад юнымі гледачамі і грамадскасцю сталіцы прадэманстрыравалі свае творчыя поспехі і майстэрства лепшыя дзіцячыя тэатры РСФСР, Украіны, Беларусі, Грузіі, Арменіі, Азербайджана... Увесь агляд прайшоў пад знакам творчага спаборніцтва тэатраў для дзяцей, якое ўзбагаціла іх вопыт, пашырыла рэпертуар і ўзняло культуру выканання. Вынікі ўсяго агляду і, у прыватнасці, заключнага туру абмяркуе ўсесаюзная канферэнцыя па пытаннях развіцця дзіцячых тэатраў, якая пачала сваю работу.

Агляд яскрава паказаў творчую спеласць тэатраў для дзяцей, наяўнасць у іх адароных акторскіх і рэжысёрскіх сіл, здольных ствараць мастацка-дасканалыя спектаклі, выхоўваючыя ў комуністычным духу юных грамадзян совецкай краіны.

Заключны тур агляду адкрыў адзін з лепшых і старэйшых дзіцячых тэатраў—Ленінградскі тэатр юнага гледача, якім кіруе народны артыст РСФСР А. А. Бранцэў. Тэатр паказаў два спектаклі: «Пабег» Д. Шчэглова і «Кот у ботах» Л. Мак'ева і С. Дзіліна. Абодва спектаклі — цікавыя і значныя работы тэатра.

«Пабег»—бадай, першы вопыт стварэння п'есы і спектакля для дзяцей на матэрыяле гісторыі рэвалюцыйнага руху, гісторыі большэвіцкай партыі пярэдадня 1905 года. І поспех спектакля абумовіў, у першую чаргу, добра выпісаны ў п'есе і дасканала распрацаваны акторам В. Якаўлевым вобраз прафесіянала-рэвалюцыянера, мужнага большэвіка таварыша Сашы. Сапраўднай рамантыкай, захапляючай юнага гледача, авеян гэты вобраз.

Адной з самых вясёлых і яркіх казак, багата прадстаўленых на аглядзе, з'явілася пастаноўка «Ката ў ботах». Сюжэт гэтай казкі—аб трох братах, з якіх малодшы атрымаў у спадчыну ад бацькі толькі ката, каторы потым шмат зрабіў на карысць свайго гаспадара,—шырока вядомы. Выдатна паставіў рэжысёр П. Вейсбрэм гэты спектакль—поўную весялосці, бляску і дасціпнасці музыкальную камедыю. Па-майстэрску выканала цэнтральную ролю—ката ў ботах—заслужаная артыстка РСФСР А. Охіціна.

Заслужана гарачае адабрэнне гледача выклікалі спектаклі «Піонер Павел Марозаў» А. Якаўлева, пастаўлены В. і С. Тэзаўроўскімі ў Маскоўскім абласным тэатры юнага гледача і «Адзіная баявая» А. Бруштэйн у Маскоўскім цэнтральным тэатры юнага гледача (рэжысёр В. Калесаеў).

Казка заняла значнае месца ў рэпертуары тэатраў юнага гледача. Зразумела, гэты жанр драматургіі дзіцячых тэатраў і быў асабліва шырока прадстаўлен на аглядзе ў Маскве. Пераважная большасць гэтых казак—інсцэніраваны фальклор. Так, грузінскі фальклор з'явіўся асновай казкі «Храбры Бікіла» Гамрэкелі і Нахуцрышвілі, украінскі—казкі «Івасік-Целесік» Е. Фаміна і А. Шыяна, армянскі—«Храбры Назар» Д. Дэмірчана, беларускі—«Цудоўная дудка» В. Вольскага.

І тое, што ўсе гэтыя казкі былі паказаны на аглядзе, выявіла цікавую акалічнасць: іх надзвычайнае падабенства. Ёсць шмат агульнага ў цэнтральных вобразах герояў, у развіцці сюжэтаў. І гэта, відаць, не выпадкова. Драматургі, пачаўшы ўдзячную работу па ўзбагачэнню рэпертуару дзіцячых тэатраў жанрам казкі і звярнуўшыся, вырашаючы гэту задачу, да нацыянальнага фальклору, узялі ў першую чаргу найбольш дасканала і ярка распрацаваныя сюжэты народных казак, услаўляючых мужнасць і мудрасць прадстаўнікоў народа, маючых шмат падабенства, хоць і афарбаваных пэўным нацыянальным каларытам.

Гэтыя п'есы — першы этап у распрацоўцы жанру казкі. На чарзе больш глыбокае пранікненне ў фальклор і больш дасканалая распрацоўка гэтага жанру драматургіі. На чарзе—распрацоўка больш складаных сюжэтаў і вобразаў, стварэнне казак на матэрыяле з гісторыі народаў, сучаснага жыцця і перспектыў будучыні. Але варта падкрэсліць галоўнае: зварот драматургаў да фальклору даў шмат карысці.

Беларускі тэатр юнага гледача паказаў на аглядзе «Цудоўную дудку» Віт. Вольскага ў пастаноўцы народнага артыста БССР Е. А. Міровіча. Спектакль гэты, адзін з лепшых у рэпертуары тэатра, добра вядомы юным гледачам нашай рэспублікі і карыстаецца ў іх вялікай любоўю. Спектакль прайшоў з поспехам. Ён паказаў, што Тэатр юнага гледача БССР творча вырас, умацаваўся і знаходзіцца ў радзе лепшых тэатраў для дзяцей.

Вельмі цёпла сустрэлі гледачы выканаўцаў ролей Янкі (арт. В. Ігнацьеў), караля (акт. В. Чэмелоў), канцлера (арт. Н. Цурбакоў), повара (арт. Н. Навіцкі) і ўвесь ансамбль спектакля.

Вельмі шкада, што Беларускі тэатр юнага гледача быў прадстаўлен на заключным аглядзе толькі адным спектаклем (а ў гэтым віна кіраўніцтва тэатра), што не дало магчымасці больш шырока і пераканаўча паказаць сілы і здольнасці акторскага калектыва.

У дні агляду была арганізавана сустрэча калектыва Тэатра юнага гледача БССР з маскоўскімі крытыкамі, прысвечаная абмеркаванню спектакля «Цудоўная дудка». Выступаўшыя тт. Алперс, Чычэраў і інш. падвергі спектакль дасканаламу разгляду і зрабілі рад прынцыповых заўваг. У прыватнасці, выказана думка, што існуе пэўны стылёвы разнабой у пастаноўцы «Цудоўнай дудкі», не апраўдана разграніченне карцін на рэальныя, бытавыя (першая і заключная) і на казачныя (сярэднія). Залішне шаржыравана паказаны адмоўныя персанажы (кароль, канцлер, астралог і інш.) Іх вобразы будуюцца на адной якасці—дурноце, што абмяжоўвае акторскія магчымасці. Досыць штучна ўведзена ў спектакль «опернасць».

Выступленне на аглядзе і абмеркаванне спектакля дало шмат карыснага калектыву. Мастацкае кіраўніцтва тэатра і акторскі калектыў, відаць, зробяць адпаведныя вывады аб неабходнасці больш дасканалай і глыбокай работы над спектаклямі свайго рэпертуару.

І з новай сілай заключны тур творчага агляду тэатраў для дзяцей узнімае пытанне аб неабходнасці большай увагі совецкіх драматургаў да ўзбагачэння драматургіі дзіцячых тэатраў. Не створаны яшчэ дасканалыя п'есы аб совецкай школе, аб юным пакаленні совецкіх грамадзян, аб гераізме і мужнасці совецкіх людзей,—п'есы, якія-б па-сапраўднаму захаплялі выабражэнне юных гледачоў, дзейсна служылі, сілай класічных вобразаў людзей сацыялістычнай эпохі, фарміраванню свядомасці і выхаванню маральных якасцей дзяцей—падрастаючага пакалення будаўнікоў комунізма. Гэтыя п'есы павінны з'явіцца ў самы бліжэйшы час. Аддаць свае сілы і натхненне гэтай пачэснейшай справе—абавязак нашых драматургаў.

Масква. (Наш спец. кар.)

СПЕКТАКЛІ РЭЧЫЦКАГА ТЭАТРА

Рэчыцкі калгасна-саўгасны тэатр адкрыў зімовы сезон п'есай А. Філімонава і В. Дзістлера «Золата». Над гэтым спектаклем калектыў працаваў плодатворна і шмат.

З поспехам прайшлі аднаўленыя тэатрам у гэтым сезоне спектаклі мінулага рэпертуару; «Сады цвітуць» Масса і Кулічэнкі і «Хто смяецца апошнім» К. Крапівы.

Наступныя пастаноўкі Рэчыцкага тэатра — «Прыгонныя» па твору Лескова, «Тупейны мастак» і «Тэв'е-малочнік» па Шолам-Алэйхему.

М. В.

Рэчыца.

В. Нефед, Вал. Багуслаўскі

Аб тэатральнай крытыцы

Раздумваючы аб крытыцы, у прыватнасці, аб тэатральнай крытыцы, нельга не думаць аб вялікім імені, аб Бялінскім, аб «неістаўным Вісарыёне», нельга не думаць аб яго артыкулах, у якіх няма ні адной фразы, ні аднаго слова, не народжаных самім натхненнем, не сагрэтых ваяўнічай страснасцю.

Артыкулы Бялінскага аб тэатры глыбока змястоўны. І ў той-жа час яны вызначаюцца ўсхваляванасцю, пламеннасцю пачуццяў. І ў гэтым выдатным спалучэнні іх значнасць і арыгінальнасць. Такое спалучэнне дае вобразнае ўяўленне аб спектаклі, аб ігры актораў. У артыкулах Бялінскага не толькі ўнутраны сэнс, змест іх, але і форма служаць узнаўленню цэласнага вобраза спектакля.

Калі мы чытаем Бялінскага, мы не толькі разумеем спектакль, — мы адчуваем, мы бачым яго. Артыкул «Мачалаў у ролі Гамлета» дае не толькі ацэнку, аналіз ігры Мачалава, але ў той-жа час узнаўляе сцэнічны вобраз Гамлета—Мачалава. У гэтым яго мастацкасць. Гэта і робіць яго адэкватным па свайму значэнню ў галіне мастацкай крытыкі вобразу, створанаму геніем Мачалава. У Бялінскага трэба вучыцца!

Нам здаецца, што асноўная традыцыя ў спадчыне Бялінскага — тэатральнага крытыка, якая павінна быць намі прадоўжана, гэта яго ўменне ўзнаўляць цэласны мастацкі вобраз, сцэнічнай з'явы, яго ўменне ўздзейнічаць на чытача не толькі мысляю, але і пачуццём. У Бялінскага не толькі змест, але і форма жыве і хвалюе. Між іншым, гэта традыцыя знайшла свой працяг у творчасці А. В. Луначарскага. Вобразнае ўзнаўленне спектакля, ігры актораў, мае яшчэ адну перавагу. У сілу сваёй мастацкасці, вобразнасці, яно набывае значэнне гістарычна-тэатральнага дакумента. І ў гэтым сэнсе работы Бялінскага аб тэатры прадстаўляюць велізарную каштоўнасць. Яго артыкулы аб Мачалаву — гэта самы яркі, самы жывы помнік вялікаму рускаму актору. І гэта самая правільная крыніца для гісторыка, вывучаючага творчасць Мачалава.

Нельга не думаць аб гісторыі тэатра. Яе трэба ствараць. Нельга не думаць аб будучым тэатры. А будучае тэатра ў многім залежыць ад ведання яго мінулага...

У наш час непамерна вырасла значэнне мастацтва, яго роля ў грамадскім жыцці. Тэатр у нашай краіне зрабіўся адным з мацнейшых сродкаў барацьбы за комунізм. І ці-ж не гэта павінна быць крыніцай нашага палітычнага тэмпераменту, нашай ваяўнічасці ў крытыцы, нашай страснасці!

Мы ведаем рад цікавых совецкіх тэатральных крытыкаў, — Юзоўскі, Гурвіч і інш. Іх артыкулы аб тэатры вылучаюцца вялікай страснасцю, тэмпераментам, мэтанакіраванасцю. Сваёй працай яны прыносяць вялікую карысць маладому совецкаму тэатру.

Але колькі ў нас пішацца артыкулаў, рэцэнзій, ад якіх павявае холадам, у якіх вы не знойдзеце ні намёку на тую кроўную зацікаўленасць, без якой нельга стварыць нічога значнага, сапраўды карыснага. Нам могуць запярэчыць: не ўсе валодаюць тэмпераментам, здольнасцю моцна і глыбока адчуваць, не ўсім дадзена гэта прыродай. Правільна. Але тады не абавязкова пісаць аб тэатры.

Ёсць і такая катэгорыя крытыкаў, якія пішуць аб усім і... у прыватнасці, аб тэатры. Да ўсяго яны адносяцца больш-менш сур'ёзна. І тэатру яны аддаюць часу і разумовай энергіі не больш і не менш, чым усяму астатняму. Але-ж гэта лёгкадумны падыход да справы тэатральнай крытыкі, бо нельга займацца ёю несур'ёзна, без спецыяльных ведаў і ўмення, а галоўнае — без вялікай любві да тэатра.

Калі пішаш крытычны артыкул, трэба ясна ўяўляць сабе, што дасць ён рэжысёру, актору, гледачу. Калі гэтага ўяўлення няма, праца загіне марна.

Перад намі рэцэнзіі аднаго тэатральнага крытыка з газеты «Комуніст» (гор. Бабруйск): «Казка» (спектакль Рускага драматычнага тэатра БССР) і «Любоў Яравая» ў Палескім драматычным тэатры. Рэцэнзіі напісаны адным аўтарам — М. Оркіным. І напісаны яны па заветнай схеме: пара слоў аб п'есе, некалькі слоў аб пастаноўцы, і ўжо абавязкова — актор «Ікс» з роляю «паспяхова справіўся», а актор «Ігрэк» іграў з «шчырым хваляваннем»... і г. д., і т. п. Рэцэнзенты не любяць адказваць на пытанні — чаму? як? Бездаказальнасць — вось загана многіх нашых рэцэнзій.

Вось артыкул аб «Любві Яравой» у Палескім тэатры. Спачатку некалькі слоў аб п'есе. Затым канстатацыя, што спектакль «Любоў Яравая» — лепшы спектакль у гэтым тэатры, таму што ў ім «адчуваецца благатворная і арганізуючая роля рэжысёра». Затым аўтар гаворыць аб выканальніцы ролі Яравой, «кожнае слова, кожны жэст якой глыбока прадуманы». Актор, які выконвае ролю Кошкіна, вядома, стварае «вобраз вялікага абаяння і благародства», а артыст, які іграў Швандзю, «ролю правёў у асноўным удала, заваяваўшы сімпатыі глядальнай залы». І ўвогуле, вядома, «спектакль «Любоў Яравая» — несумненная ўдача».

Каму патрэбна такая рэцэнзія? Шкоды, вядома, яна не зробіць, але і карысці ад яе ніякай.

А вось рэцэнзія аб «Казцы». Гэта проста дэзарыентыруючая рэцэнзія. Вядома, што спектакль «Казка» — творчая няўдача Рускага драматычнага тэатра БССР. У спектаклі не была знойдзена спецыфіка, арамат гэтай цікавай рамантычнай п'есы. Мары, паэзія — усё гэта было моцна знішана, і спектакль атрымаўся шэрым. Калектыў тэатра сам зразумеў гэта, зняў спектакль і заняўся сур'ёзнай яго дапрацоўкай. Але здарылася так, што гэты спектакль убачыў рэцэнзент М. Оркін. І з яго рэцэнзіі мы даведваемся, што са сваёй «задачай малады калектыў тэатра ў асноўным (якое слова!) справіўся ўдала», што «спектакль радуе», што ў ім ёсць «абаянне маладосці» і яшчэ нешта. Заканчваецца рэцэнзія словамі, што «спектакль «Казка» з падкупляючай сілай паказвае сапраўдную паэзію нашай барацьбы і работы, рамантыку» і г. д. І гэта напісана аб яўна няўдаўшымся спектаклі!

Некаторыя рэцэнзенты, імкнучыся быць арыгінальнымі, жадаючы сказаць нешта новае, выглядаюць проста смешнымі. Напрыклад, у артыкуле «Жаніцьба Бялугіна» (газета «Большэвік Палесся») І. Шыфман, характарызуючы вобраз Бялугіна, робіць адкрыццё: «Бялугін, па Астроўскаму, мае душу, характар і сэрца». Далей мы даведваемся, што актор Горыч, які выконвае ролю Бялугіна, умее выражаць наіўную радасць «у казліных прыжках». Актрыса Дубровіна, вядома, «абаяльная артыстка, авалодаўшая майстэрскай ігрой.(!?) Яна вядзе сваю ролю на той лагічнай паслядоўнасці, на якой яе вядзе аўтар». (!?)

Часта некаторыя рэцэнзенты пішуць аб п'есе, а думаюць, што пішуць аб спектаклі. У Рэчыцкай газеце «Зара комуны» змешчана рэцэнзія на спектакль Рэчыцкага калгасна-саўгаснага тэатра «Мой сын». Тры чвэрці рэцэнзіі прысвечана разгляду п'есы і толькі адна чвэрць — пастаноўцы і ігры актораў. І вось тут пачынаецца галоп і жангліраванне словамі: актрыса Валерская «у ролі Марыі Эстэраг паказала сябе актрысай вялікага драматычнага тэмпераменту і глыбока (?) рэалістычнай школы». «Вельмі добры актор Герашчанка ў ролі абывацеля Іозефа Ловач». Герашчанка «знайшоў цэлую гамму патрэбных тонаў» (!?). «Палі Эстэраг (актор Нікалаеў) запомніцца надоўга», а актрысы Ларэ і Лісіцкая іграюць «некалькі слабей». Далей аўтар абяцае: «у заключэнне — аб мастацкім афармленні спектакля». І што-ж ён гаворыць? Не многа, не мала, тры словы: «Яно вельмі ўдачна». Вось і ўсё.

Што будуць думаць творчыя работнікі тэатра аб тэатральных крытыках пасля такой, з дазволу сказаць, рэцэнзіі?

Прыведзеныя прыклады не выключэнне. Гэта зрабілася ўжо звычайнай з'явай. Але мірыцца з гэтым нельга. Мы пераконаны ў тым, што работа тэатральнага крытыка, рэцэнзента мае метадалагічныя падставы, веданне якіх абавязкова. І рэцэнзент, які-б ён ні быў «маститы» і дараваты, не можа працаваць без ведання гэтых падстаў, таксама, як самы дараваты актор не можа выявіць свайго даравання без ведання асноў акторскага майстэрства, таксама, як самы таленавіты рэжысёр не можа выявіць свайго даравання без ведання асноў рэжысёрскага майстэрства і г. д.

Ясна, напрыклад, што беручыся пісаць рэцэнзію, трэба пачынаць з п'есы. Гэта закон работы над тэатральнай рэцэнзіяй. Між тым, вялікая колькасць памылковых разважанняў аб спектаклі з'яўляецца вынікам няведання п'есы. Калектыў тэатра працуе над п'есай некалькі месяцаў, а то і год. І на працягу ўсяго гэтага часу ён чытае яе. Якое права мае рэцэнзент прэтэндаваць на лепшае веданне п'есы, якое права мае ён крытыкаваць і вучыць (а крытык павінен не толькі абагульняць вопыт творчасці, але і вучыць), калі ён не ведае па-сапраўднаму п'есу? Не, мала прачытаць п'есу. Трэба ўмець прафесіянальна разабрацца ў ёй, трэба ўмець карыстацца пры рабоце над п'есай метадам драматургічнага аналізу, трэба ўмець знаходзіць у п'есе адзінае дзеянне, трэба ўмець знаходзіць «скразное дзеянне» па Станіслаўскаму кожнага з персанажаў, правільна ўскрываць сцэнічныя ўзаемаадносіны дзеючых асоб.

Драматургічны аналіз пазбавіць рэцэнзента ад разважанняў наогул, надасць яго рабоце канкрэтнасць і дзелавітасць.

***

Творы тэатральнага мастацтва трэба разглядаць у святле задач, якія стаяць перад нашым тэатрам. Барацьба за сацыялістычны тэатр — вось што павінна быць унутранай тэндэнцыяй і мэтанакіраванасцю кожнай работы аб тэатры, кожнай рэцэнзіі.

Мы з'яўляемся сведкамі нараджэння новых сцэнічных традыцый. Засвойваючы лепшыя традыцыі сусветнай, рускай тэатральнай культуры мінулага, мастак сучаснасці творыць новае, якасна сваё, асаблівае, тое, чаго ніколі яшчэ не было і не магло быць.

Мы ведаем, што вядучым метадам совецкага мастацтва з'яўляецца сацыялістычны рэалізм. Аб сацыялістычным рэалізме шмат гавораць і пішуць. Але што такое сацыялістычны рэалізм? Часам мы самі не заўважаем, што паняцце сацыялістычнага рэалізма жыве ў нашым свядомасці як нейкая абстрактная катэгорыя, як нейкі закон, мыслімы, але не адчуваемы.

А ў любым сапраўды таленавітым спектаклі на совецкай сцэне, створаным совецкім мастаком, не можа не быць элементаў новага стылю, элементаў сацыялістычнага рэалізма. Не трэба шукаць недзе ў «пязведаных» сферах мастацтва. Не, ён у жывой штодзённай рабоце нашых рэжысёраў, актораў. Ён тут — у м... у трактоўцы пастаноўшчыка, у сцэнічных адносінах актора да вобраза, у мы... мастацкага афармлення, у музыцы і ... Вось дзе трэба шукаць новае, вось дзе трэба шукаць тое, што мы называем сацыялістычным рэалізмам. І толькі тады мы адчуем яго і зразумеем, чаго мы дасягнулі, у чым пацярпелі паражэнне, правільна будзем вызначаць [illegible]

ПОШУКІ ЖАНРУ

★

С. Гершэнзон

★

Для ўсіх ясна, што «Отэлло» Шэкспіра — трагедыя, «Жаніцьба Фігаро» Бомаршэ—камедыя. Значыць, нельга іграць Отэлло ў камедыйным плане, не парушыўшы ў корані ўсёй сістэмы пабудовы геніяльнай трагедыі. Бясспрэчна і тое, што ператварэнне камедыйнага твора ў драматычны ці трагедыйны прыводзіць да змянення ўсёй сутнасці самога твора.

Жанр вызначае сабою і стыль, і рытм, і кампазіцыйную форму твора.

Час, нарэшце, нашым пастаноўшчыкам, акторам уясніць сабе, што жанр — гэта ледзь не самае рашаючае для кожнага мастацкага твора. Чым больш чоткі жанр, тым больш выразна вядучая ідэя—аснова асноў кожнага твора. Чым выразней жанр, тым больш чоткі стыль, рытм, кампазіцыя. Мастак, які ўмее правільна вызначыць і знайсці жанр драматургічнага твора, знойдзе і правільны ключ к спектаклю. Ці не гэтым тлумачыцца поспех Аляксея Папова ў пастаноўцы камедыі «Украшчэнне строптівай» Шэкспіра ў Цэнтральным тэатры Чырвонай Арміі? Здаўна гэту камедыю ігралі як фарс. Прышоў совецкі майстар і сказаў: не, «Украшчэнне строптівай» нічога супольнага з фарсам не мае; гэта — рамантычная камедыя, у якой, як і ў шэкспіраўскай трагедыі, дадзены сутычкі характараў, паядынак волі. У выніку такой трактоўкі ўсё стала на сваё месца, зайграла, заззяла ўсімі колерамі. І са сцэны загучаў усхваляваны голас Петручча, чалавека моцнай волі і характару. Блізка яму і рамантычная Катарына.

Горкі вопыт другога тэатра падказвае нам, як гібельна адбіваецца на спектаклі забыццё ці страта пачуцця жанру. Гутарка ідзе аб пастаноўцы «Рэвізора» у тэатры імя Вахтангава. Тут сатырычная камедыя геніяльнага Гогаля падменена вясёлым вадэвілем, напоўненым трукацтвам і штукарствам.

Пацвердзім нашу мысль аб значэнні жанру яшчэ адным прыкладам — параўнаннем двух спектакляў «Крэмлёўскія куранты» Н. Пагодзіна. Гутарка ідзе аб спектаклі Дзяржаўнага Віцебскага беларускага драматычнага тэатра і Дзяржаўнага Рускага драматычнага тэатра БССР (Магілеў).

Ні ў каго няма сумнення ў тым, што абодва тэатры імкнуліся стварыць спектакль аб Леніне, бо п'еса, у якой ёсць вобраз Леніна, становіцца п'есай аб Леніне. Гэта зразумелі пастаноўшчыкі—рэжысёр Владычанскі у Магілеўскім тэатры, рэжысёр Аксёнаў у Віцебскім тэатры.

Аднак, вынікі атрымаліся розныя. Першаму ўдалося стварыць усхваляваны рамантычны спектакль, у цэнтры якога—вобраз Леніна. У другім — у Віцебскім—жанравыя бытавыя карцінкі сталі на чале ўсяго і тым самым затушавалі цэнтральны вобраз п'есы. У адным спектаклі мы пачулі голас не толькі нашага «учора», але і нашага сёння і будучага. У другім паказаны забаўныя карцінкі мінулага: тут і цікавы быт, і анекдот... І здарылася гэта не па віне выканаўца цэнтральнай ролі. Народны артыст БССР П. С. Малчанаў (Віцебск) больш упэўнены, свабодны і менш звязаны, чым яго калега, народны артыст БССР Д. А. Орлоў (Магілеў), які ўпершыню выступае ў ролі Леніна. Не, відаць, не ў гэтым справа. Справа ў тым, што рэжысёр Владычанскі знайшоў правільны ключ к п'есе, вызначыўшы яе як рамантычны твор. Другі-ж рэжысёр, Аксёнаў, трапіў у палон забаўных камедыйных сцэн.

Спынімся больш падрабязна.

«Крэмлёўскія куранты» — п'еса аб ленінскай мары, што асвятляла цяжкія дні 1920 года. «У вёсках людзі жывуць пры лучыне,—гаворыць у п'есе Ільіч.— Нават жабракі жывуць горш, чым да вайны». А ў гэты час рабочыя, узброеныя ленінскай праўдай і верай, выйшлі ў паход за здабыццё шчасця для чалавецтва.

Ускраіна лесу ля возера. Пачатак вясны. Світанне. На ўскраіне званар Казанок і Сцёпка. Цікаўны вясковы хлопец Сцёпка прагна слухае апавяданне званара аб сустрэчы з Леніным, аб героях народа. Нечакана прыходзіць малады «сухапутны» марак Рыбакоў, які суправаджае Леніна на паляванні.

— «Чаму задумчывы Ільіч? Аб чым марыць ён? Магчыма, у гэту хвіліну ён складае планы?.. А калі недарма ён усю дарогу рысаваў нам Расію?» — разважае сам з сабою Рыбакоў.

Устрывожан і стары егер Чудноў. Яго бровы нахмураны, поступ павольны, ён углядаецца ў ранішнюю імглу.

— Ты паслухай, — ціха гаворыць Рыбакоў, — як на возеры нешта шалясціць, шапоча... Чудноў, а Чудноў, як па-твойму, аб чым цяпер думае Владзімір Ільіч?

— Цішэй, Рыбакоў. Я чую яго крокі Ён сам сюды ідзе...

Так заканчваецца першая карціна ў Магілеўскім тэатры. Рэжысёр Владычанскі ўводзіць гледача ў абстаноўку, дае магчымасць рэальна адчуць вялікую сілу ленінскай мары. Нас ахапляе гордае пачуццё за чалавека, які там, ля возера, на пні, моўчкі ўглядаючыся ўперад, вырашае сумненні і спрэчкі ваеннага комунізма і прадбачыць светлую будучыню совецкай краіны.

Другая карціна пераносіць гледача ў хату Чуднова. У праходзе — руская печ. Лаўкі, стол, пакрыты белым абрусам. На сцяне партрэт Леніна. На ўсім адбітак чакання велізарнай падзеі. Жонка Чуднова, Анна, і снаха яго Ліза завіхаюцца ў хаце. Ля печкі Лізіны дзеці — Маруся і Сцёпка. Яны не адрываюць вачэй ад уваходных дзвярэй. Найдрабнейшы шолах прыводзіць усіх у замяшанне. У гэтай карціне не цяжка захапіцца бытавымі дэталямі, экзотыкай. Але рэжысёр затушаваў быт, адхіліў і забаўны анекдот. Ён прымушае нас думаць і пранікацца глыбокай павагай да Анны, да Лізы. Кожную з іх хвалююць свае пытанні. Анна не ведае, як аднясецца Ільіч да бажніцы, Ліза хвалюецца ад невядомасці, што скажа Ільіч, даведаўшыся, што яе муж, Раман, захапіўся нейкім там «пролеткультам», спектаклямі.

Усё, што робіцца ў карціне, падрыхтоўвае паяўленне Ільіча. Не самі па сабе цікавяць нас людзі, а іх думы і пачуцці. Сям'я Чуднова чакае вялікага ч[illegible]. Гэтага чакае і глядач! І вось адчыняюцца дзверы, на парозе — у высокіх паляўнічых ботах, у шапцы-вушанцы, у куртцы — паяўляецца Ільіч (артыст Д. А. Орлоў). Спыніўшыся ля ўваходу, ён усмешкай сустрэў гаспадынь дома, жартам адказаў на першыя, загадзя падрыхтаваныя пытанні...

Дзве першыя карціны ўпэўнена ўводзяць нас у рамантычны свет спектакля, які акружае цэнтральны вобраз п'есы. Пятая карціна — гутарка Леніна з Рыбаковым, — адно з лепшых месц у спектаклі. —паказвае новыя рысы правадыра. Ленін марыць! Вось гэтыя тры карціны першага акта з'яўляюцца фундаментам усяго спектакля. Наступныя карціны, асабліва сёмая (у кабінеце Леніна), замацоўваюць дасягнутае.

Вельмі цікавая ў плане ўсёй рамантычнай пастаноўкі канцоўка спектакля. Тут, праўда, не ўсё яшчэ знойдзена. Гутарка ідзе аб святле, аб афармленні, аб адсутнасці ў апошняй карціне дэталей, якія-б надалі ўсяму дзеянню рэальную пераканаўчасць. Але і ў такім выглядзе апошняя карціна дазваляе сцвярджаць, што і тут Владычанскі перакідвае масток у тую рамантычную будучыню, аб якой так дзейсна марыць Ленін.

Авансцэна. На фоне закрытай заслоны гадзіншчык і вартавы. Ці зайграюць крэмлёўскія куранты, абвяшчаючы аб пачатку новай эры? — вось чым заклапочаны гэтыя людзі. Тэй-жа трывогай ахоплен і вялікі правадыр. «Не падвядуць?» — пытаецца ён у гадзіншчыка. Але вось куранты зайгралі «Інтэрнацыянал», і Ленін з глыбокай радасцю загаварыў:

— Гэта вялікая справа, таварышы. Гэта ўжо назаўсёды. Свой крэмлёўскі час яны будуць лічыць вякамі. І калі збудзецца ўсё, аб чым марым і спрачаемся, яны будуць адлічваць новы час і той час будзе пачаткам новых электрыфікацый, летуценняў, дзярзанняў...

Пры апошніх словах адкрываецца заслона. Перад намі Спаская вежа. Святло навакол. Прышла вясна, вясна чалавецтва. Навакол зеляніна, усё ўсміхаецца. І стары Крэмль памаладзеў, і людзі, суправаджаючыя Леніна, памаладзелі. Вось яны ўзнімаюцца ўверх па сходках, мы бачым іх на фоне Крэмля. Радуецца Ільіч, праціраючы наперад руку, слухаючы, як крэмлёўскія куранты іграюць урачысты гімн пераможнага класа.

Не цяжка заўважыць, як трапна адшукаў рэжысёр Владычанскі ключ да рамантычнага спектакля, разумеючы, што толькі так можна вырашыць складанейшую задачу: даць спектакль аб Леніне.

Сказанае зусім не азначае, што спектакль Магілеўскага тэатра беззаганны, што ў ім усё знойдзена. Далёка не так! У спектаклі нямала сырых месц, шэрых плям, не ўсе акторы адчулі арамат рамантыкі. Той-сёй цягнецца к пяжкаважкаму быту. Але не аб гэтым цяпер гутарка. Галоўнае заключаецца ў тым, што тэатр зразумеў жанр п'есы. А гэта дапамагло яму знайсці і кампазіцыйную форму, і адпаведны рытм, і ўзаемадзеянне частак. Гэта падкрэслівае асноўную лінію спектакля—лінію развіцця вобраза В. І. Леніна.

Як мы вышэй адзначылі, спектакль у Віцебскім тэатры патануў у патоку быту і анекдотаў (за асобнымі выключэннямі, тэкст той-жа).

Рагледзім карціны.

Карціна першая. Той-жа гай ля возера. Тая-ж ускраіна лесу. І ранішняя імгла. Толькі касцёр на пярэднім плане. А ля шалаша егер Чудноў і матрос Рыбакоў. Той-жа, прыкладна, тэкст. Але рэжысёр ледзь прыкметнымі бытавымі штрыхамі і дэталямі пераводзіць карціну ў другі план, у план бытавой камедыі. Тут яна толькі намячаецца.

Ля кастра мірна вядуць гутарку два чалавекі: Чудноў і Рыбакоў. Здавалася-б, яны робяць тое самае, што і ў Магілёўскім тэатры. Але тут важна не тое, што яны робяць, а як робяць. А гэта надае ўжо зусім іншую характарыстыку.

Перад намі дзве бытавыя фігуры. Калі раней нас цікавілі думы і пачуцці, дык цяпер выклікаюць цікавасць людзі самі па сабе. Вось Рыбакоў (арт. Іваноў) камедна раскінуўся ля кастра. А стары егер падміргвае Рыбакову: маўляў, папаўся геройскі матрос, закахаўшыся ў маскоўскую дзяўчыну. Паступова гэтыя дэталі робяцца даўлеючымі, яны надаюць карціне зусім іншы сэнс. Нечакана ловіш сябе на мыслі: а якая гэта дзяўчына? І ці ўдасца матросу «не па сабе дрэва зрубіць?»

Другая карціна нібы пачынае спектакль нанава. Яна з'явілася проста знаходкай для рэжысёра Аксёнава. Тут ён можа даць волю свайму выабражэнню. Тут быт прадстае са ўсёй непрыкрытасцю.

Ля печы сядзіць званар Казанок, гэтакі блажны. (Відаць, рэжысёр і актор не зразумелі жарту Анны аб Казанку: «Блажны ён, бясхітрасны»). Рэжысёр не шкадуе фарбаў. Калі блажны, дык абавязкова юродзівы, каб смяшней было. То ён глухаваты і Анне даводзіцца крычаць над самым яго вухам, то, забыўшыся на сваю глухату, старанна моліцца, то твар яго асвятляецца юродзівай усмешкай, а то раптам кідаецца к дзвярам і яго кожны раз варочаюць. Пасмяшней! Такі дэвіз. Казанок становіцца ў цэнтры таго, што адбываецца, ён даўлее над усім. Бадай, толькі дзеці Лізы не ўступаюць яму. Яны такія-ж смешныя і анекдатычныя. Вось Маруся з смешнымі касічкамі, з застыўшымі зрачкамі, з задзёртым носікам, у вельмі шырокай палатнянай кашулі. Вось і Сцёпка-растрэпа, не цікаўны, а дзіўны. Дзеці, як і Казанок, цікавяць гледача ў данай трактоўцы самі па сабе, як бытавыя фігуры. А ці-ж аб іх п'еса?

Трэцяя карціна паказвае нам новыя бытавыя фігуры. Не эпоха паказана, а людзі, гандлюючыя ля Іверскіх варот. З дакладнай акуратнасцю выводзіць рэжысёр кожную фігуру. Запамінаецца смешны чалавек з вусамі, гандляр парнаграфічнай літаратурай. Але агульнай характарыстыкі няма. Мы запамінаем не агульны фон, а асобныя фігуры.

Нават чацвертую карціну рэжысёр умудрыўся выкарыстаць у плане бытавой камедыі. Гасцініца «Метрополь», цяпер Другі Дом Советаў. У Рыбакова свой нумар. У пакоі няўтульна, накідана. Тут сустрэліся два чалавекі: Маша і Рыбакоў. Розныя, незразумелыя адзін другому. Матрос кахае Машу, прагна прыглядаецца да невядомай яму істоты, прышоўшай к яму «з іншай планеты». Таксама прагна прыглядаецца Маша да невядомага ёй героя «Авроры». У яе шырока раскрыты вочы. Яна робіць крок у новае жыццё, якое і страшна ёй і да якога няўхільна цягне яе.

Вельмі смешна глядзець, як капрызнічае Маша, а Рыбакоў пацее, не знаходзячы пункту апоры пад нагамі. Звычайная жанравая сцэнка, якая сама па сабе вырашана нядрэнна. Але не аб гэтым яна гаворыць.

На змену названым чатыром прыходзіць пятая карціна. Набярэжная Масква-ракі ля Крэмлёўскай сцяны. Вызваленая ад натуралістычных дэталей і бытавізму, гэта карціна рэзка адрозніваецца ад папярэдніх. Яна вырашана ў іншым плане. Тут Аксёнаў знайшоў суровыя, скупыя фарбы. Тут прасторна і вольна выканаўцу ролі Леніна. Вось, узрадаваліся мы, пачынаецца, нарэшце, п'еса аб Леніне. Усё, што было дасюль, гэта толькі фон, які хутка выветрыцца з памяці.

Радасць наша была заўчаснай. Наступная, шостая, карціна зноў вярнула рэжысёра к бытавой камедыі. Затое сёмая—у кабінеце Леніна — прадаўжае лінію пятай. І тут мы заўважаем, што спектакль мае дзве паралельныя лініі. З аднаго боку, бытавыя жанравыя карціны, з другога — ленінскія сцэны. Нібы два рэжысёры змагаюцца ў спектаклі, разрываючы яго адзінства і цэласнасць.

Вернемся, аднак, к сёмай карціне. Спынім сваю ўвагу на выканаўцу ролі Забеліна. Артыст Сяргейчык знайшоў вельмі правільны рысунак калючага, непакорлівага і перапалоханага інтэлігента. Ён не злоўжывае дэталямі. Жэсты яго скупыя. Увесь ён замкнуты. За гэтай скупасцю, замкнутасцю мы адчуваем унутраную сілу буйнага вучонага, якога запрасілі ў Крэмль, — не кожнага інжынера маглі выклікаць к Леніну.

Зноў сустракаем мы Забеліна ў дзевятай карціне. Што з ім зрабілася? Ці Сяргейчык іграе другую ролю? Не, гэта Забелін. Той-жа грым, той-жа касцюм. Але не той Забелін. Буйны вучоны, мысліцель ператварыўся ў бытавую, мы-б нават сказалі, у дробную фігуру. Вось ён шчакоча сваякоў, вось ён шчыпле песіміста. Не, ад былога Забеліна не засталося і следу.

Дзе ён, гэты непакорлівы няўжыўчывы чалавек? Гутарка з Леніным, сапраўды, зрабіла на яго выключнае ўражанне. Яго, інжынера Забеліна, вынулі з бярлогі, яму далі магчымасць вярнуцца к сваёй стыхіі, к творчай рабоце. Тым не менш Забелін застаецца Забеліным. Пройдзе яшчэ нямала часу, пакуль Забелін прыдзе к комунізму. І прыдзе ён,—як гаварыў Ленін,—не так, як прышоў падпольшчык-прапагандыст, літаратар, а праз даныя сваёй навукі. Таму і гутаркі не можа быць аб шпаркай і паспешнай перабудове Забеліна.

Удумайцеся ў тэкст п'есы.

Ленін: — Ну як?— Пойдзе працаваць? (Аб Забеліну, які толькі што пакінуў кабінет).

Сталін:—Пайсці то пойдзе, але ці будзе працаваць?

Ленін:—А мы яго паставім пад ваш нагляд...

Ленін і Сталін разумеюць, што працэс перабудовы свядомасці інжынера Забеліна не такі прасталінейны і прымітыўны.

У ранейшым плане, у жанры бытавой камедыі, вырашана і дзесятая карціна. Тут рэжысёр і акторы не грэбуюць нават вадэвільнасцю і натуралістычнымі дэталямі. Маша прызнаецца Рыбакову ў каханні. Рыбакоў бяжыць за Машай. Праз секунду ён варочаецца і задаволена выцірае губы, маўляў, нацалаваўся! Досыць! Вось да чаго дайшло!

Магчыма, што тэкст п'есы «Крэмлёўскія куранты» і камедыйны талент Пагодзіна часамі даюць магчымасць для ператварэння рамантычнай п'есы ў бытавую камедыю. Але ці ёсць, аднак, неабходнасць у гэтым, ці ёсць апраўданне такому эксперыменту, які ў вялікай ступені знішчае самы аўтарскі замысел?

Вось так страта пачуцця жанру жорстка помсціць за сябе.

Спектакль Віцебскага тэатра не пазбаўлен і раду цікавых сцэн, значных месц. Ёсць у ім вялікія акторскія ўдачы. Але ўсё гэта разрознена, раскідана негаспадарлівай рукой. І здарылася гэта таму, што ўвесь остаў спектакля хісткі і рыхлы.

Дык ці не час загаварыць ў нашых тэатрах больш сур'ёзна аб праблеме жанру?

„ТРЫЛЬБІ“



Сцэна з V акта оперы «Трыльбі» у ордэна Леніна тэатры оперы і балета БССР. У партыі Біллі — засл. арт. БССР **В. Лапін**, у партыі Трыльбі — засл. арт. БССР **В. Мальнова.**

Фота Л. Папковіча.

Дзяржаўны ордэна Леніна тэатр оперы і балета БССР паказаў прэм'еру оперы «Трыльбі» кампазітара Юрасоўскага. Опера Юрасоўскага адносіцца да ліку вельмі невялікай музычнай спадчыны, пакінутай гэтым музыкантам. Юрасоўскі памёр, не паспеўшы па-сапраўднаму разгарнуцца і поўнасцю раскрыць свой кампазітарскі і драматычны талент. Ён пражыў усяго 26 год (1897 — 1922).

Майстэрства, асабліва ў галіне музычнай творчасці, дасягаецца ў спелыя годы, таму зусім законамерна тая з'ява, якую мы бачым у «Трыльбі». Музычная мова оперы, нягледзячы на свежасць і арыгінальнасць, на вялікую эмацыянальнасць і шчырасць пачуццяў кампазітара, усё-ж вызначаецца эпігонствам і некаторай эклектычнасцю.

Юрасоўскі ўзяў для сваёй оперы не вельмі ўдзячнае лібрэта. Сюжэт яго па сваёй накіраванасці не можа сур'ёзна цікавіць нашага гледача. Вельмі халульныя, напышчаныя і мала жыццёвыя вобразы, створаныя драматургам Ге. Праўда, кампазітар удыхнуў вялікае жыццё ў вобразы оперы, ва многім выправіў і ўзняў танны твор лібрэтыста, але да канца перамагчы недахопы лібрэта ён не здолеў.

Кароткі змест оперы наступны: тры англійскіх лорды — мастакі-любіцелі Біллі, Таффі і Сандзі жывуць у Парыжы бяспечным жыццём багемы. Да іх у майстэрню прыходзіць пазіраваць прыгожая дзяўчына Трыльбі. Трыльбі натура вялікай шчырасці і дзіцячай чыстаты, робіць вялікае ўражанне на экспансіўнага і непасрэднага Біллі.

У гэтым-жа асяроддзі бывае таленавіты, але пакуль яшчэ не прызнаны шырокай публікай, піяніст і кампазітар Свенгалі. Ён даўно кахае Трыльбі і марыць зрабіць з яе сусветную спявачку, бо яна валодае добрым голасам. Трыльбі адхіляе каханне Свенгалі.

Біллі просіць Трыльбі стаць яго жонкай. Яна добра бачыць тое бяздонне, якое ляжыць паміж ёю, беднай натуршчыцай, і знатным лордам Біллі, і не хоча верыць Біллі. Біллі страсным прызнаннем у каханні, прысягай у вернасці прымушае яе згадзіцца быць яго нявестай. Свенгалі спрабуе выратаваць Трыльбі, разумеючы, якая небяспека пагражае ёй у выпадку шлюбу з Біллі. Ён рысуе ёй страшную карціну будучага, калі Біллі пакіне яе.

Трыльбі афіцыяльна лічыцца нявестай Біллі, але канчатковае вырашэнне яе лёсу залежыць ад маці Біллі — лэдзі Бегот. Прадугадваючы рашэнне лэдзі Бегот, Свенгалі забірае Трыльбі к сабе.

Свенгалі становіцца славутым піяністам, Трыльбі — спявачкай з сусветным імем. Слава Трыльбі, яе гучнае імя сціраюць грань паміж ёю і Біллі. Лэдзі Бегот згаджаецца на шлюб Трыльбі з яе сынам.

Але адносіны Трыльбі да мінулага, хоць яна і жыве ўспамінамі аб Біллі, робяцца глыбей і сур'ёзней. Яна разумее ўсю глыбіню і сілу кахання да яе Свенгалі. Ёй хочацца зноў вярнуць той час, калі ім так добра жылося ў майстэрні мастакоў. Але жыццё зламала яе сілы і яна гіне.

Пастаноўшчыкам оперы «Трыльбі» з'яўляецца малады рэжысёр Ольга Барысевіч, для якой гэта работа з'явілася адказным экзаменам, адказным таму, што самы твор гэты мае шмат пагрэшнасцей, недахопаў, паколькі танныя эфекты, банальны меладраматызм пастаўлены ў ім на першы план. У задачу рэжысёра ўваходзіла перамагчы недасканаласці і парокі твора, пазбегнуць штампу.

І работа рэжысёра, бясспрэчна, заслугоўвае ўвагі і адабрэння. Дарэчы, пастаноўка гэта — бадай, першая вялікая самастойная работа маладога рэжысёра. Пастаноўка сведчыць аб наяўнасці ў О. Барысевіч тэатральнай культуры, музыкальнага чуцця, сцэнічнага густу. Сваю творчую экспазіцыю спектакля рэжысёр вырашае простымі, скупымі, змястоўнымі штрыхамі. Адчуваецца, што рэжысёр імкнуўся выходзіць не з чыста знешніх эфектаў, а хацеў знайсці перш за ўсё тыповыя з'явы, характэрныя асаблівасці, уласцівыя таму асяроддзю, якое паказвае твор.

Але не ўсё ўдалося рэжысёру. Некаторае пярэчанне выклікае першы акт, пабудаваны ў музычных і драматургічных адносінах з вялікай эмацыянальнасцю, страсцямі, характэрнымі ўзлётамі і дынамічнымі падзеннямі, акт, які патрабаваў асабліва ўважлівага і чулага падыходу к яго рэжысёрскай інтэрпрэтацыі, але які вырашан рэжысёрска некалькі сухавата, вяла і статычна. Хацелася-б у гэтай фактычнай прэлюдыі, якой з'яўляецца першы акт, бачыць больш дзярзання, смеласці і творчай вынаходлівасці. Хацелася-б таксама больш свежага, арыгінальнага сцэнічнага талкавання ў другім акце, у сцэне гарачага прызнання паміж Біллі і Трыльбі. Тут можна было знайсці шмат цікавага, захапляючага не толькі ў сэнсе стварэння мізансцэн, але і ва ўсім псіхалагічным раскрыцці сцэны.

Да ліку некаторых шурпатасцей і пагрэшнасцей трэба аднесці і афармленне спектакля, якое таксама мае вялікае дачыненне да рэжысёрскай экспазіцыі спектакля. Рэжысёр не здолеў падпарадкаваць і аб'яднаць работу афармляўшых спектакль трох мастакоў — з рознымі густамі і розным мастацкім тэмпераментам — адной, сваёй ідэі. Адчуваецца разнагалоссе ў перадачы мастакамі свайго разумення і адчування эпохі, часу, касцюма і інш. Нягледзячы на некаторыя шчаслівыя вынаходкі афарміцеляў, ёсць супярэчлівыя дэталі. У першым акце — бледнасць і малавыразнасць майстэрні мастакоў, аляпаватасць партрэтаў; наўмысная прыбедненасць і скромнасць другога акта, пакоя лорда; тое-ж і ў пакаэе Парыжскага тэатра. Гэта сведчыць аб тым, што рэжысёр, які павінен кіраваць мастакамі ў ажыццяўленні імі яго творчага замыслу, не здолеў зрабіць гэтага.

Усё-ж неабходна адзначыць, што рэжысёрам праароблена вялікая і адказная работа. Дэбют О. Барысевіч у якасці опернага рэжысёра, у якасці самастойнага пастаноўшчыка трэба прызнаць удалым.

Трыльбі ў выкананні народнай артысткі БССР Р. Млодэк пакідае надзвычай добрае ўражанне. Р. Млодэк валодае сцэнічнай абаяльнасцю. Вобраз Трыльбі Р. Млодэк перадае тонкімі нюансамі, з захапляючай шчырасцю і цеплынёй. Вакальная частка партыі цесна спалучаецца з дасканалай ігрой актрысы. Трыльбі—Млодэк захапляе падкупляючай прастатой. Актрыса выдатна пераўвасабляецца. У гутарцы з Біллі мы бачым яе пяшчотна кахаючай, глыбока адданай натурай, гатовай для Біллі на ўсё. Зусім іншай бачым мы яе ў сутычках з Свенгалі. Гэтыя, здавалася-б, невялікія дэталі і кантрасты ў суме ствараюць надзвычай выпуклы, ярка абрысаваны, хвалюючы гледача жаночы вобраз. Благародства, адчуванне сцэнічнага такту, пачуццё меры ніколі не пакідае актрысу. У вакальных адносінах актрыса таксама дасягнула поспехаў—моцная прафесіянальнасць спалучаецца з вялікай артыстычнасцю.

Цэнтральная партыя оперы—Свенгалі ў выкананні заслужанага артыста БССР І. Мурамцава пакідае глыбокае ўражанне. Свенгалі—Мурамцаў—вобраз, насычаны вялікай духоўнай сілай і эмацыянальнасцю. Выкананне партыі Свенгалі Мурамцавым вызначаецца дасканаласцю ў вакальным плане і ў сцэнічных адносінах. З першага свайго выхаду актор трымае глядзельную залу ў вялікім напружанні. Актор здолеў увайсці ў глыбіню ролі і музыкі.

З выключным тэмпераментам праводзіць актор сцэну чацвертага акта за кулісамі Парыжскага тэатра, сцэну са скрыпачом перад прыходам Трыльбі. На тонкіх псіхалагічных нюансах, па прадуманасці, з якой Мурамцаў разам з акторам Мегарскім дасягае драматызму, што цалкам захапляе гледача, можна меркаваць аб тым, якая вялікая работа праароблена акторам. З прыходам Трыльбі сцэна ў выкананні Мурамцава і Мегарскага дасягае вялікай вышыні не толькі вакальнай, але і драматычнай.

Заслужаны артыст БССР М. Дзянісаў выдатна выконвае партыю Сандзі. З бляскам праводзіць актор цяжкія і вельмі выйгрышныя месцы ў першым акце. У выкананні Дзянісава Сандзі—энергічны, тэмпераментны.

Партыя Біллі ў выкананні заслужанага артыста БССР І. Балоціна гучыць дасканала, музыкальна. Некалькі схематычны і спрошчаны вобраз лэдзі Бегот у выкананні актрысы Бржэзінскай. Праўда, актрыса добра аўладала вакальнай частакй партыі. Але хацелася-б больш чопарнасці, больш спакою, халоднасці і ўпэўненасці бачыць у вобразе Бегот.

Музычная частка спектакля на вышыні. Аркестр пад кіраваннем дырыжора-ордэнаносца Н. Грубіна смела і шматгранна раскрывае ўсе дэталі партытуры. Месцамі гучанне аркестра дасягае вялікіх драматычных узлётаў і ўздымаў, але ў той-жа час аркестр тонка і далікатна акампаніруе, падтрымліваючы вакальную частку спектакля. З пачуццём было праведзена скрыпічнае сола (саліст тав. Цырынскі). Неабходна таксама адзначыць добры строй і чыстату інтанацый у духавой групе аркестра, якая зараз значна вырасла (канцэртмейстар групы тав. Штэйман).

Нягледзячы на недасканаласць самога твора і асобныя хібы пастаноўкі, спектакль у цэлым, дзякуючы высокаму майстэрству выканаўцаў, будзе мець поспех у гледача.

А. РАТНЕР.

Мастацкая самадзейнасць калгаса

Калгас «Праўда» Мсціслаўскага раёна мае свой радыёвузел і клуб са стацыянарнай кіноўстаноўкай. Культфонд калгаса—10 тысяч рублёў. Усё гэта складае спрыяльныя ўмовы для развіцця мастацкай самадзейнасці, і ў «Праўдзе» працуюць гурткі: драматычны, харавы і музычны. Кіруе гурткамі дырэктар калгаснай школы Н. А. Чыж.

За восем месяцаў яго кіравання драмгуртком пастаўлены: «Без віны вінаватыя» Астроўскага, «Любоў Яравая» Трэнёва, «Сваты» Гурскага, «Назар Стадоля» Шэўчэнкі ды іншыя. З некаторымі з гэтых пастановак гурток выязджаў у Мсціслаўль і ў калгас «Першае мая». У драмгуртку 17 чалавек.

Нядрэнна працуе і харавы гурток. У яго рэпертуары: «Бывайце здаровы», «Лянок», «Кацюша», «Па ваеннай дарозе», «Партызаны» ды інш.

У рэпертуары музычнага гуртка: «Лявоніха», «Казачок», «Арлёнак».

Поруч з калгаснай самадзейнасцю развіваецца і школьная, дзе яна прадстаўлена танцавальным гуртком, які выконвае «Казачок», «Лезгінку» і «Венгерку».

Трэба думаць, што з адкрыццём тэатральнага памяшкання, якое ў калгасе будуецца, мастацкая самадзейнасць калгаса «Праўда» набудзе яшчэ больш шырокія маштабы.

М. І.

Мсціслаўскі раён.

Гастролі хора філармоніі ў Магілеве

У магілеўскім кінотэатры «Радзіма» даў рад канцэртаў хор Дзяржаўнай ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга філармоніі БССР. Можна падзякаваць Дзяржаўную філармонію БССР за пасылку ў Магілеў свайго хора. Яго праслухала каля 20 тысяч жыхароў горада. Хор пазнаёміў слухачоў з радам беларускіх, яўрэйскіх, украінскіх, грузінскіх народных песень, з творамі Чайкоўскага, Рымскага-Корсакава, з творамі раду совецкіх кампазітараў.

Калектыў хора правёў значную грамадскую работу. За час свайго прабывання ў Магілеве ён арганізаваў сустрэчу з вучнямі музычнай школы, музычнага вучылішча і іх выкладчыцкім персаналам. Быў арганізаван канцэрт з удзелам вучняў. Мастацкі кіраўнік хора тав. Бары правёў з харавым аддзяленнем вучылішча некалькі заняткаў.

Пажадана, каб Дзяржаўная філармонія, улічыўшы вопыт пасылкі свайго хора ў Магілеў, не абмежавалася гэтым. Магілеўскія працоўныя чакаюць прыезду к ім ансамбля народных інструментаў і ансамбля песні і пляскі.

Г. КАЛАТНОВЕР.

Магілеў.

НОВЫЯ ЎДЗЕЛЬНІКІ ДЭКАДЫ СОВЕЦКАЙ МУЗЫКІ

★

С. Нісневіч

★

Роля дэкады совецкай музыкі і эстрады заключаецца не толькі ў дэманстрацыі новых твораў, яна мае і вялікае выхаваўчае значэнне, стымуліруючы творчую ініцыятыву совецкіх кампазітараў.

На дэкадзе дэманструюцца як поспехі кампазітараў, так і выканаўцаў — іх уменне правільна трактаваць замыслы кампазітараў, даваць ім творчае ўвасабленне.

Хочацца спыніцца на праграме маладых удзельнікаў дэкады — Беластоцкай філармоніі і Дзяржаўнай эстрады. Маладая Беластоцкая філармонія ўключыла ў праграму дэкады рад буйных сімфанічных твораў. З прычыны таго, што слухачы заходніх абласцей БССР яшчэ не паспелі пазнаёміцца з творамі совецкіх кампазітараў, што дэманстраваліся на ранейшых дэкадах, у праграму уключан рад твораў, якія адносяцца к дасягненням кампазітараў мінулых год.

Так, напрыклад, будзе выканана 18-я сімфонія Мяскоўскага, прысвечаная 20-годдзю Вялікага Кастрычніка. Пабудаваная на народна-песеннай тэматыцы, яна абапіраецца на лепшыя дасягненні рускай музычнай класікі, характэрна яснасцю музыкальнай мовы. Затым 1-я сімфонія Шастаковіча — твор, хоць і навеяны сучаснай заходнееўрапейскай школай кампазітараў, але ў якім ясна сказваецца меладычная і гарманічная мова, своеасаблівы рытм і інструментоўка вельмі таленавітага кампазітара. І, нарэшце, 1-я сімфонія Хрэннікава, па-мастацку пераўтвараючая ў свет гукаў перажыванні кампазітара, звязаныя з гадамі грамадзянскай вайны. А таксама уверцюра Кабалеўскага з оперы «Майстар з Кламсі» — твор, які вызначаецца шчырасцю і эмацыянальнасцю музычнай мовы, свежасцю і багаццем гармоніі.

Шырока будзе прадстаўлена і канцэртная творчасць. Фортэп'янны канцэрт Хачатур'яна нарадзіўся з народнай армянскай песні і пляскі. Гэта твор менш за ўсё цытатны, народна-песенныя і танцавальныя інтанацыі знайшлі ў кампазітара сваё творчае пераўвасабленне. Піяністычныя веды кампазітара дапамаглі яму надаць канцэрту адпаведную фактуру. Скрыпічны канцэрт кампазітара Столава будзе ўпершыню выконвацца на дэкадзе. Гэта адзін з выдатных твораў, выконваемых на дэкадзе, які сведчыць аб вялікіх здольнасцях аўтара. Свежасць гарманічнай і меладычнай мовы, метра-рытмічнага рысунку, нарэшце, выдатнае пераўтварэнне (у II частцы) беларускай народнай песні-калыханкі — усё гэта патрабуе спецыяльнага і грунтоўнага аналізу. Выконваць канцэрт будзе дацэнт Дзяржаўнай беларускай кансерваторыі Аміітон, які на працягу некалькіх год прапагандыруе творчасць беларускіх совецкіх кампазітараў. Танцавальная сюіта Клумава — віртуозны фортэп'янны твор, пабудаваны на матэрыяле беларускіх народных танцаў у стылю ліставўскіх рапсодый. Неабходна таксама адзначыць цікавую па сваёй выразнасці і шчырасці мелодыю (з варыяцыямі для віяланчэлі) беларускага кампазітара Власава.

Вакальная творчасць будзе прадстаўлена творамі Аракішвілі, Пракоф'ева, Шапорына, Свірыдава, беларускіх кампазітараў Туранкова, Цікоцкага, Шчэглова і інш. у выкананні артыстаў Дзяржаўнага тэатра оперы і балета.

Вялікую цікавасць прадставіць выступленне ансамбля песні і пляскі — калектыва, правёўшага выключна вялікую работу пад кіраваннем кампазітара і этнографа Шырмы.

Дзяржаўная беларуская эстрада ўпершыню прымае ўдзел у дэкадзе. Справядлівасць патрабуе адзначыць, што праграма Дзяржаўнай беларускай эстрады падбіралася кіраўніцтвам старанна, прычым аддадзена належная ўвага паказу творчасці беларускіх кампазітараў. Факт выканання артыстамі эстрады такіх складаных твораў, як беларуская танцавальная сюіта (фортэп'яна) Клумава, яго-ж скерцо і імправізацыя (скрыпка) і санаціна Кабалеўскага, а таксама арый з опер «Міхась Падгорны» Цікоцкага і «Кацярына» Шчэглова — сведчыць аб тым, што Дзяржаўная беларуская эстрада ўзбагацілася радам моцных выканаўцаў.

Дэкада пачынаецца 5 снежня. Пажадаем яе ўдзельнікам новых творчых поспехаў.

Адказны рэдактар І. Д. ГУРСКІ.

Адрас рэдакцыі газеты: Мінск, Совецкая, 76, Дом пісьменніка. Тэлефон 25-394. Газета «Літаратура і Мастацтва» выходзіць штотыднёва.

Мінск, друкарня «Звязды».